

САЛОДКІЯ ПАДАРУНКІ АД «КАМУНАРКІ» ДЛЯ МЕДЫКАЎ 11

ЯК ЛІДАР ВЯДОМАГА ГУРТА ЎРАТАВАЎ КАШТОЎНУЮ ІКОНУ 15



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 МАЯ 2020 г. АЎТОРАК № 85 (29199)

# ПАД МІРНЫМ НЕБАМ



Пастаянная экспазіцыя ваеннай тэхнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага перыяду каля Кургана Славы, што на дваццатым кіламетры ад Мінска, нагадвае інтэрактыўны музей пад адкрытым небам. Сюды нярэдка прыязджаюць сем'ямі, і малыя з задавальненнем гуляюць на грозных машынах, якія для іх мірнага дзяцінства ўсяго толькі вялікія цацкі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, галоўны ўрач 1-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў:**

*«Ні адзін медык не застаўся сам-насам з праблемай. Самае галоўнае — падтрымка грамадскасці, людзей, якія з першых дзён аказвалі дапамогу медработнікам. Іх вельмі шмат. Вялікі дзякуй і нізкі паклон усім, хто падтрымлівае нас».*

## КОРАТКА

- Помнікі Вялікай Айчыннай вайны можна ўбачыць на кадастравай карце.
- **Старшыня Мінгарвыканкама Анатоль Сівак: «Эканоміка Мінска абвалілася б амаль на траціну, калі б прадпрыемствы закрылі на каранцін».**
- Беларускія дэпутаты сёння разгледзяць законапраект аб амністыі да 75-годдзя Перамогі.
- **У кітайскай правінцыі Хубэй 30 дзён запар няма новых выпадкаў заражэння COVID-19.**
- Урослы ў дрэва снарад часоў вайны знайшлі ў Гродне.



- **Больш за пяць тон рыбы выпусцілі ў Зэльвенскае і Чыгірынскае вадасховішчы.**
- У Мінску можна аплаціць праезд у грамадскім транспарце смартфонам.
- **У Беларусі будуць паступова здымаць забарону на наведванне лясоў.**
- Польшча прыступае да будаўніцтва газапровода Baltic Pipe.

ISSN 1990 - 763X

20085

Пра крэдыты і не толькі

## КОЛЬКІ ТЫ ВІНЕН БАНКУ?

**Цяпер кліент можа раз на месяц даведацца пра гэта абсалютна бясплатна**

**У нашай краіне з першых дзён мая пачалі дзейнічаць новыя дакументы, якія мяняюць асобныя падыходы да крэдытавання насельніцтва. Адпаведныя рашэнні прынятыя пастановамі праўлення Нацбанка ад 31 сакавіка № 99 і № 100. Як растлумачыла на анлайн-відэабрыфінгу намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання банкаўскіх аперацый Нацыянальнага банка Вольга ІЛЮКЕВІЧ, змены «ў цэлым будуць спрыяць павышэнню якасці крэдытавання, а таксама зніжэнню рызык пагаршэння фінансавага стану фізічных асоб і аптымізацыі іх плацяжоў па абавязацельствах».**

### Калі ты падумаў, што ўжо расплаціўся, — а дарэмна...

У адпаведнасці з абноўленай інструкцыяй нашага фінансавага рэгулятара, любы камерцыйны банк абавязаны прынамсі адзін раз у месяц даваць крэдытаатрымальніку па запыце без спагнання ўзнагароджання інфармацыю аб запазычанасці па крэдытным дагаворы. Інфармацыя павінна ўключаць, у прыватнасці, звесткі аб запазычанасці па крэдыце (асноўны доўг), аб суме працэнтаў за карыстанне ім, а таксама аб іншых абавязацельствах, такіх як няўстойка (штраф, пеня).

Таксама крэдытаатрымальнік мае права патрабаваць ад банка пісьмовае пацвярджэнне поўнага выканання абавязацельстваў па крэдытным дагаворы. «Гэтая норма дазволіць паменшыць колькасць выпадкаў, калі інфармаванасць грамадзян аб наяўнасці абавязацельстваў па дагаворы прыводзіць да ўзнікнення пратэрмінаванай запазычанасці», — тлумачыць Вольга Ілюкевіч. Даволі часта бываюць такія выпадкі, калі чалавек шчыра лічыць, што ўжо цалкам разлічыўся з банкам за атрыманы крэдыт, пасля чаго перастае плаціць па рахунках. Пра такія гісторыі мы ўжо нядаўна пісалі.

А тым часам па недаплачаным крэдыце суміруецца непагашаны доўг, працэнты і штраф у выглядзе няўстойкі і пені. Невялікая сума часткі доўгу пачынае расці як снежны ком. Таму кліенту лепш мець на руках менавіта пісьмовую гарантыю таго, што цяпер ён сапраўды нікому нічога не вінен.

СТАР. 4

## ДРУГОЕ «Я» АНЛАЙН

**Уключыць рэжым «вярблюда», зрабіць правільную «кошку» і запусціць «свінню»... У рэаліях жорсткіх «джунгляў» рынку гамяльчанкі — уладальніцы ўласнай справы — дзеляцца стаўленнем да сучаснага бізнес-стрэсу, які стаў выдатным матыватарам для далейшага развіцця іх бізнесу.**

### Рыхтуем план «Б»...

У Гомелі кіраўнік вытворчага прадпрыемства па вырабе абсталявання для развіцця фізічных, псіхаэмацыянальных і сэнсарнаматорных кампетэнцый у дзяцей **Аксана ШАЎЧЭНКА** павялічвае гук на мабільніку і адказвае на мае пытанні па канферэнц-сувязі. Чую — за рулём. Мабільнасць і гатоўнасць заўсёды працаваць па найноўшых тэхналогіях, кажа, заўсёды дапамагае. Яна расказвае гісторыю сваёй жаночай каманды. Так суразмоўніца называе калектыў прыватнай вытворчасці, якая да цяперашняй сітуацыі забяспечвала патрэбы ў спецыялізаваным абсталяванні для ЛФК па ўсёй краіне.

СТАР. 5



Аксана ШАЎЧЭНКА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Усе пытанні для таго, каб лячыць людзей, вырашаны»

**Мерапрыемствы да Дня Перамогі і эпідэміялагічную сітуацыю ў краіне абмеркавалі 3 мая на нарадзе ў Прэзідэнта.**

## «МЫ НЕ МОЖАМ АДМЯНІЦЬ ПАРАД»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што план мерапрыемстваў да Дня Перамогі быў прадстаўлены даўно. Пры гэтым кіраўнік краіны падкрэсліў глыбокае ідэалагічнае і эмацыянальнае значэнне парада ў гонар 75-годдзя Перамогі: ***«Павінен сказаць, што мы не можам адмяніць парад. Проста не можам. Я доўга над гэтым думаў. Вядома, гэта эмацыянальная, глыбока ідэалагічная рэч.*** Трэба помніць, што тыя людзі (удзельнікі вайны. — **«Зв».**) паміралі, можа, і ад вірусаў, іншых хвароб. Але яны гэтага не адчувалі часам і пра гэта не думалі. І паміралі яны дзеля нас, як бы гэта пафасна ні гучала. І падумайце, што скажуць людзі. Можа, не адразу, праз дзень, праз два пасля гэтага, — скажуць, што спалохаліся».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў арганізатараў, што калі будзе прынята гэтая прапанова, то ***«нікога цягнуць на гэта мерапрыемства не трэба». «Не хочуць людзі, баяцца, берагуць здароўе — мы гэта зразумеем. Дастаткова сёння ахвотных — тысячы і тысячы людзей хочуць, каб гэтае мерапрыемства прайшло»,*** — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што сярод тых, хто хоча наведаць парад, ёсць і ветэраны Узброеных Сіл. «Удзельнікаў вайны засталося зусім няшмат. Яны разумеюць, і мы павінны іх зберагчы. Хоць яны і першыя запатрабавалі, каб іх прывезлі на гэтае мерапрыемства. Зразумела, што ім ужо за 90. Падумаем, як з імі быць. Я прытрымліваюся сваёй тактыкі — ***старых людзей трэба пабераччы.*** Мы ўсе бачым, што гэтыя інфекцыі перш за ўсё чапляюцца за старых, хоць хварэюць і маладыя. Таму нікога на гэта масавае мерапрыемства цягнуць не трэба», — яшчэ раз падкрэсліў Прэзідэнт, выказаўшы ўпэўненасць, што парад — не самае небяспечнае з пункту гледжання эпідэміёлагаў і вірусолагаў мерапрыемства. «Таму што ***яно будзе арганізавана як належыць.*** Пра гэта мы пазней скажам. Магчыма, і з трыбуны гэтага парада», — сказаў ён.



Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ні ў мінулыя, ні ў наступныя святы і выхадныя дні абмежаванняў у краіне не ўводзілася і людзі самі вырашалі, дзе ім быць. ***«І трэба адзначыць, мы гэта заўважылі, людзі вельмі акуратна ставяцца да свайго здароўя.*** Неяк разгрупаваліся. Не было гэтага збору людзей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## «Я ВЕЛЬМІ СУР'ЁЗНА КАНТРАЛЮЮ ГЭТЫЯ ПРАЦЭСЫ»

Гаворачы пра эпідэміялагічную сітуацыю, якая складваецца, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць звярнуць увагу на лячэнне пнеўманій. «Аналізуючы ўсю сітуацыю, нам асаблівую ўвагу, што мы сёння і робім, трэба звярнуць на пнеўманіі. У нас назіраецца (няхай на 40—50 чалавек за чатыры месяцы) прырост пнеўманій да ўзроўню мінулага года. Так, гэта проста мізэр пры нашай сістэме аховы здароўя, але пнеўманіі крыху падраслі. Думаю, па годзе сітуацыя выраўняецца і гэтак далей. І мы бачым, ***што галоўнае для нас сёння — лячэнне людзей — пнеўманіі.*** Прашу гэта мець на ўвазе. ***Для мяне гэтае пытанне нумар адзін. І я вельмі сур'ёзна кантралюю дадзеныя працэсы»,*** — заявіў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, тут галоўнае нават не колькасць выяўленых людзей, у якіх дыягнаставалі каранавірус, а менавіта сітуацыя па пнеўманіях.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, вырашаны ўсе неабходныя пытанні, не толькі звязаныя з бяспекай урачоў у бальніцах, але і на іншых узроўнях. ***«Усе пытанні для таго, каб лячыць людзей, вырашаны.*** Сёння ўжо сродкі аховы мы экспартуем. Скажу шчыра: і людзі малайцы. Яны гэту маску не надзяваюць дзе прыйдзецца. У грамадскіх месцах недзе, у краму ідуць... Спачатку рынуліся ў аптэкі, скупілі дэфіцыт. Цяпер гэтага дэфіцыту няма. Мы экспартуем гэтыя маскі, — сказаў Прэзідэнт. — Дзякуй кітайцам, Сі Цзіньпіну дзякуй, адгукнуўся на маю просьбу. Праслаў нам адзін станок, цяпер другі — для масак, рэспіратараў. У нас будуць цэлыя фабрыкі дзякуючы гэтай дапамозе». «Лекаў, як мне міністр дакладвае і не толькі, у нас хапае. Прытым для лячэння самымі сучаснымі новымі спосабамі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што ўрачы ў Беларусі ўжо атрымалі неабходны вопыт лячэння тых, хто захварэў, і навучыліся правільна дзейнічаць у цяперашніх умовах.

***«На сённяшні дзень удаецца стрымліваць захваральнасць у цэлым. Што датычыцца інфекцыйных захворванняў, то мы ідзём дакладна ў тым прагнозе, які быў два месяцы таму далажаны мне Міністэрствам аховы здароўя і спецыялістамі, якія займаюцца непасрэдна інфекцыйнымі захворваннямі»,*** — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што пасля пандэміі ўжо можна будзе з улікам атрыманага вопыту пагаварыць з народам асобна, як трэба жыць, якія ўрокі спасцігнуць і якія высновы зрабіць. «Абсалютна падтрымліваю меркаванне спецыялістаў, што ***з гэтымі бедамі, рознымі вірусамі нам давядзецца жыць. Іх будзе ў будучым не менш. Таму што мы нахабна ставімся да навакольнага асяроддзя, да прыроды і нават адно да аднаго. І гэта бяда, і нават вось гэты псіхоз, які разгарнуўся, інфадэмія, як мы называем, часткова пойдзе на карысць людзям у тым плане, што прымусіць нас падумаць, як жыць далей»,*** — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

У цэлым ён падкрэсліў, што ніякай катастрофы няма, але пакуль нельга расслабляцца. ***«Нам трэба напружана вытрымаць да пачатку лета.*** Думаю, што з божай дапамогай мы неяк справімся, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Губернатары на гэта нацэлены. У іх пасяўная кампанія — праблема нумар два. Галоўная праблема — дапамагчы ўрачам, Міністэрству аховы здароўя ў гэтай рабоце». Прэзідэнт таксама заклікаў падтрымаць урачоў.

## ПРА ШТО СВЕДЧАЦЬ ЛІЧБЫ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі занята ўсяго 10 % апаратаў ШВЛ ад тых, што ёсць у наяўнасці. «Я гляджу кожныя суткі інфармацыю. Сёння атрымаў. Таксама 9 % у нас ад тэсціраваных (выяўлена выпадкаў захворвання на COVID-19 ад колькасці зробленых тэстаў. — **«Зв.»**). Па пнеўманіі, што я вельмі кантралюю, занята ўсяго 10 % ад наяўных апаратаў. У нас сёння на ШВЛ крыху больш за 200 чалавек. А апаратаў ШВЛ — 2,5 тысячы плюс паўтары тысячы наркозна-дыхальных, калі гэта патрэбна будзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама заявіў, што ад агульнай колькасці пнеўманій толькі ў 30 % дыягнаставаны COVID-19. «Гэта таксама вельмі добры паказчык. Таму я сёння прэтэнзій ні да Міністэрства аховы здароўя, ні да галоўных урачоў бальніц не прад'яўляю. ***Мы дакладна выпрацавалі сістэмы лячэння інфіцыраваных людзей»,*** — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт расказаў, што яму напярэдадні перадалі статыстычныя звесткі з падрабязным аналізам. ***«За чатыры месяцы агульная смяротнасць у краіне зменшылася на 1,5 %.*** Калі кожны квартал будзем утрымліваць 1,5—2 %, то мы на 7-8 % зменшаем смяротнасць. Гэта вельмі добры паказчык на фоне таго, што ў некаторых дзяржаў смяротнасць увесь час расце. У нас дынаміка ўніз ужо некалькі гадоў», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Як было адзначана на нарадзе, па стане на 2 мая зафіксавана 97 выпадкаў смерці пацыентаў з COVID-19. Пры гэтым за мінулы перыяд года ад хвароб сістэмы кровазвароту памерла амаль 25 тысяч чалавек, ад анкалогіі — прыкладна 6,4 тысячы. «Але што мяне ўразіла — ад атручэння алкаголем памерлі 482 чалавекі. Самазабойстваў — 470. Ужо амаль тысяча чалавек загінула ад алкаголю і самазабойстваў. На пажарах загінулі 218 чалавек. На дарогах за чатыры месяцы ў аварыях загінула 163 чалавекі. Патанула 89 чалавек — амаль столькі, колькі ад розных хвароб, ускладненых COVID-19», — прывёў статыстыку Аляксандр Лукашэнка.

«Але самае галоўнае, што колькасць загінулых зніжаецца квартал да квартала мінулага года, красавік да красавіка мінулага года і гэтак далей», — адзначыў беларускі лідар.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта.**

# «Мы арганізаваліся, уся краіна, для таго, каб перамагчы гэтае няшчасце»

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з калегамі з Казахстана і Малдовы фармат запланаванага на 19 мая саміту ЕАЭС у Мінску. Былі закранутыя і іншыя важныя пытанні, у першую чаргу святкаванне Дня Перамогі 9 Мая.**

Раніцай адбылася тэлефонная размова з Прэзідэнтам Казахстана Касым-Жамартам Такаевым па ініцыятыве казахстанскага боку. Суразмоўцы павіншавалі адзін аднаго і братнія народы з 75-годдзем Вялікай Перамогі.

## «МЫ ГОДНА ЯГО ПРАВЯДЗЁМ»

З віншавання з надыходзячым святам распачалася і размова Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам па відэасувязі. Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што ніводнае з запланаваных у Беларусі да 75-годдзя Вялікай Перамогі мерапрыемстваў не адменена.

Пры гэтым улады, па словах беларускага лідара, прасілі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны не настойваць на ўдзеле ў парадзе. Па словах Прэзідэнта Беларусі, краіна ўдзяляе вельмі сур'ёзную ўвагу ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія засталіся. Таму «яны даруюць, што ўпершыню за 20 з лішнім гадоў не задаволіцца просьба прывезці іх на парад».

***Галоўны аргумент на карысць правядзення парада Перамогі,*** на думку Аляксандра Лукашэнкі, — ***беспрэцэдэнтныя страты Беларусі ў Другой сусветнай вайне. «У нас няма падстаў адмяніць сёння парад Перамогі,*** — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы. — ***Але я ўпэўнены, мы годна яго правядзём, і цалкам упэўнены, што гэта ніяк не паўплывае на здароўе нашых людзей».***

## «АБЯЦАЮ ПОЎНУЮ БЯСПЕКУ»

Пра запланаваны мінскі саміт Аляксандр Лукашэнка паведаміў малдаўскаму калегу наступнае: «Я сёння размаўляў са спадаром Такаевым — Прэзідэнтам Казахстана. Яны цяпер кансультуюцца з Прэзідэнтам Расіі. Я і вам магу сказаць, і яму сказаў — я ваш слуга: як вы скажаце, так і будзе. Я арганізоўваю мерапрыемствы, гатовы 19 мая прыняць усіх вас. Абяцаю поўную бяспеку».

Прэзідэнт Беларусі дадаў, што яму не надта падабаецца фармат відэаканферэнцыі, бо ён лічыць, што сур'ёзныя пытанні трэба абмяркоўваць асабіста. «Мяркую, што перашкод для правядзення вочна гэтага пасяджэння на самым высокім узроўні сёння няма. Але ўсё будзе залежаць ад вас, ад маіх гасцей. Калі гэта немагчыма, мы можам у рэшце рэшт перанесці гэтае мерапрыемства на некалькі дзён, пакуль сітуацыя не будзе поўная і спакойная».

Ігар Дадон пацвердзіў, што з задавальненнем возьме ўдзел у вочнай сустрэчы.

## «МАЕМ СВОЙ ШЛЯХ ПЕРААДОЛЕННЯ»

Суразмоўцы спыніліся і на тэме барацьбы з пандэміяй COVID-19.

Прэзідэнт Малдовы расказаў, што абмежаванні, уведзеныя ў яго краіне, наносяць вельмі моцны ўдар па эканоміцы і сацыуме, і, хутчэй за ўсё, не будуць працягнутыя пасля 15 мая.

«Мы з таго шэрагу дзяржаў, якія змагаюцца з эпідэміяй, крыху выбіваемся, — заўважыў на гэта Аляксандр Лукашэнка. — Не хачу стамляць вас лічбамі, скажу толькі адно (беларусам гэта кажу праз дзень): ***дай Бог, каб мы прайшлі гэтую эпідэмію на тым узроўні і так, як сёння складваецца ў нас сітуацыя!»***

***«Мы ўвесь вопыт вывучылі за гэтыя месяцы, пачынаючы ад Кітайскай Народнай Рэспублікі і заканчваючы Злучанымі Штатамі Амерыкі. І маем свае метады і свой шлях пераадолення гэтага няшчасця»,*** — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка дадаў: ***«Мы не настолькі неразумныя, каб станавіцца ў позу і дэманстраваць сваю «крутасць». На здароўі людзей гэтага ніколі не зробіш.*** Вы мяне добра ведаеце: я на гэта ніколі б не пайшоў. ***Проста мы арганізаваліся, уся краіна, для таго, каб перамагчы гэтае няшчасце».***

## «ГЭТА БУДЗЕ ДАКЛАДНА ЛЕТАМ»

Сёлетні год і для Беларусі, і для Малдовы — электаральны, у абедзвюх краінах пройдуць прэзідэнцкія выбары.

«У нас няма падстаў пераносіць іх у Беларусі, ***няма магчымасці па Канстытуцыі перанесці гэтыя выбары,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таму ***мы правядзём гэтыя выбары. У найбліжэйшы час з датай вызначымся.*** Але гэта будзе дакладна летам, бо далей за канец жніўня мы не можам праводзіць па Канстытуцыі. Крайні тэрмін — канец жніўня».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

На слыху

# «МЕРЫ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЦА, АДЭКВАТНЫЯ СІТУАЦЫІ, ШТО СКЛАДВАЕЦЦА»



## Медыкі, чыноўнікі і пацыенты пра барацьбу з каранавірусам у нашай краіне

**У суботу ў студыі тэлеканала «Беларусь1» сабраліся ўрачы і эксперты, чыноўнікі і пацыенты, эканамісты і кіраўнікі прадпрыемстваў, каб абмеркаваць галоўную цяпер тэму — барацьбу з каранавірусам. Медыкі расказалі пра змаганне за кожнае жыццё і абазначылі тэрміны, калі пандэмія пойдзе на спад. Эканамісты і кіраўнікі прадпрыемстваў растлумачылі, чаму нельга спыніць такі мегаполіс, як Мінск, і па якіх прычынах прынятыя рашэнні аб рабоце асноўных вытворчасцяў аказаліся правільнымі.**

**На 4 мая ў Беларусі паправіліся і выпісаны 3259 пацыентаў. Усяго з пачатку ўспышкі ў краіне зарэгістравана 17 489 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19, што складае 8,2 % ад колькасці праведзеных тэстаў (211 369). За перыяд распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі ў краіне ад яе памерлі 103 чалавекі.**

### РЭАНІМАТОЛАГ-АНЕСТЭЗІЁЛАГ: «У нас больш лёгкіх выпадкаў і менш цяжкіх»

У Беларусі каля 80 тысяч бальнічных ложкаў. З іх 18,5 тысячы адведзена для хворых на пнеўманіі і COVID-19, а занята такімі пацыентамі пакуль толькі 12,8 тысячы — амаль шэсць тысяч ложкаў пустуе. У прыватнасці, у Віцебску, па інфармацыі тэлеканала, усяго 25 пацыентаў знаходзіцца на апаратах штучнай вентыляцыі лёгкіх. Усяго такіх апаратаў у краіне 2257, паведаміла **дацэнт кафедры анестэзіялогіі і рэаніматалогіі, анестэзіёлаг-рэаніматолаг Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска Вольга СВЯТЛІЦКАЯ.**

— У краіне хапае апаратаў ШВЛ. У нас ёсць яшчэ рэзервовы парк наркозна-дыхальнага абсталявання, якое пры неабходнасці можа іх замяніць, — адзначыла яна. — Сёння стала відавочна, што рэспіраторны дыстрэс-сіндром — найцяжэйшае ўскладненне COVID-19 — неаднародны, і ў 70—80 % пацыентаў, якія маюць пашкоджанні лёгкіх, ён працякае нетыпова. На самай справе няма таго цяжкару ў лёгкіх, які мы чакалі ўбачыць. Парушэнні ў асноўным звязаны з мікрацыркуляцыяй крыві, а гэта значыць, што такім пацыентам, магчыма, і не трэба апаратная падтрымка.

Вольга Святліцкая расказала, што яна як урач-рэаніматолаг працуе з самымі цяжкімі выпадкамі COVID-19. І выказала меркаванне, што ў нашай краіне значна больш выпадкаў лёгкага цячэння хваробы, чым цяжкага.

— Усё, што прадпрымаецца ў нас, скіравана на тое, каб каранавірусная інфекцыя працякала ў людзей лягчэй. Тады ў нас будзе менш пнеўманій, менш спатрэбіцца апаратаў ШВЛ і вышэйшая будзе выжывальнасць. Ёсць няправільнае меркаванне, што COVID-19 — як насмарк. Гэта не так. Заўсёды будуць людзі, будуць і трагедыі. Але ў нашай краіне мы дабіваемся, каб гэтых трагедый было менш. І ўсе мы павінны ўсведамляць: каб выпрацаваўся калектыўны імунітэт, павінна перахварэць каля 60—70 % насельніцтва. Наша служба не мае ілюзій: такі працэс будзе доўжыцца да года і больш. Мы павінны гэта асэнсоўваць.

### НАТАЛЛЯ КАЧАНАВА: «Камп'ютарныя тамографы з'явяцца ў паліклініках Мінска»

**Спікер Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** паведаміла, што ў кожным раёне Мінска ў хуткім часе ў паліклініках з'явяцца камп'ютарныя тамографы.

— Мне даводзіцца займацца горадам Мінскам і кантраляваць тут пытанні аховы здароўя. Тры разы на тыдзень праводзіцца селектарная нарада з усімі кіраўнікамі бальніц сталіцы. Мы ўважліва слухаем медыкаў, якія знаходзяцца на перадавой. Была прапанова — устанавіць апараты КТ у кожны раён сталіцы, а іх у нас дзевяць. Прычым не ў бальніцы, а ў паліклініцы. Прэзідэнт падтрымаў гэтае рашэнне. Ужо падрыхтаваны паліклінікі, куды будуць устаноўлены кам'ютарныя тамографы. Мы бачым, што падчас такой няпростай сітуацыі прымаюцца рашэнні, якія будуць працаваць на перспектыву, на будучыню.

Наталля Качанава падкрэсліла, што рашэнне не закрываць краіну на каранцін было няпростае і не прымалася спантанна.

— Калі камусьці здаецца, што мы вырашылі пайсці супраць усіх, то гэта зусім не так. Гэта рашэнне абсалютна дакладна выверанае. Усё гэта прапрацоўвалася нашымі спецыялістамі — вучонымі, урачамі-інфекцыяністамі. І калі гэтыя разлікі паклалі на стол Прэзідэнту, ён прыняў рашэнне, што жыццё не павінна спыняцца. А што пасля пандэміі? А як будуць працаваць прадпрыемствы? А на што будуць жыць людзі? І мы ўбачылі, што гэта дакладнае і абсалютна правільнае рашэнне, якое сёння дае вынікі. Мы бачым, што прайшло зусім няшмат часу, і Еўропа пачала адкрывацца. Ёсць яшчэ і другі бок медаля, калі жорсткія каранцінныя меры могуць выклікаць другую хвалю эпідэміі. Меры, якія прымаюцца ў нашай краіне, адэкватныя той сітуацыі, якая складваецца, — рэзюмавала Наталля Качанава.

### НАТАЛЛЯ ЭЙСМАНТ: «З такой моладдзю ў нашай сістэмы аховы здароўя ёсць будучыня»

**Галоўны ўрач 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Ігар ЮРКЕВІЧ** расказаў, што сітуацыя ў медустанове стабільная. Каля 60 пацыентаў з 6-й бальніцы выпісаны, шэсць чалавек, якія знаходзіліся ў цяжкім стане на апаратах ШВЛ, пайшлі на папраўку і адключаны ад абсталявання.

Адна з такіх пацыентак, вядомая **беларуская спявачка і кампазітар, заслужаная артыстка Беларусі Надзея МІКУЛІЧ,** расказала, што калі даведалася пра свой дыягназ, была вельмі напалохана:

— Я трапіла ў шостую бальніцу. Двухбаковая пнеўманія, праўда, я яе не адчувала, але былі высокая тэмпература і слабасць. Не хаваю, што, начытаўшыся інфармацыі ў інтэрнэце, плакала, была ў паніцы, бо ў мяне і ўзрост, і спадарожныя хваробы.

Менавіта Надзея Анатольеўна стала тым чалавекам, які падштурхнуў кіраўніка дзяржавы заклікаць усіх людзей не апускаць рукі. Пра гэта расказала **прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ.** Таксама яна паведаміла, што сам Аляксандр Лукашэнка не рабіў тэст на каранавірус:

— Дакладна ведаю, што ён не рабіў тэст дагэтуль. У гэтым няма неабходнасці: ён жыве за горадам, фактычна ў вёсцы, за многія гады не мяняў сваіх звычак — вядзе здаровы лад жыцця, у яго моцны імунітэт, ён добра сябе адчувае. Таму неабходнасці рабіць тэст няма.

Наталля Эйсмант расказала, што ў адным са сваіх дакладаў Прэзідэнту міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік шмат часу прысвяціў студэнтам медыцынскіх ВНУ, якія па ўласным жаданні далучыліся да дапамогі ўрачам.

— Гэта ўразіла кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт даў даручэнне кожнага з іх «узяць на аловак» у добрым сэнсе гэтага слова, не ўпусціць нікога і аддзячыць тым хлопцам і дзяўчатам. Гэта азначае, што ў нашай сістэмы аховы здароўя ёсць будучыня.

Словы Наталлі Эйсмант пацвердзіла і **галоўны ўрач 3-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Наталля САЕВІЧ:**

— Усім нам уласціва пачуццё страху. У нашай клініцы мы пастараліся абмежаваць людзей старэйшага ўзросту ад самых небяспечных зон. На іх месцах засталіся працаваць урачы-інтэрны, а праз два тыдні прыйшлі добраахвотнікі — студэнты медуніверсітэта і медкаледжа.

**Урач-пульманолаг 3-й гарадской бальніцы Юлія ЛЯЎКО** была адным з тых медыкаў, хто заразіўся і перахварэў на COVID-19.

— Па адчуваннях я ставіла сабе дыягназ ВРВІ, бо хвароба працякала адносна лёгка. Але тэст паказаў каранавірусную інфекцыю. Я разумела, што ўсё будзе ў парадку. Адразу пасля выздараўлення вырашыла выйсці на работу. Цяпер пацыентам, каб падбадзёрыць, кажу, што сама перанесла інфекцыю.

### АНАТОЛЬ СІВАК: «Закрыццё вялікага горада немагчыма»

Дзякуючы таму, што беларуская эканоміка працуе, плановых лічбаў у першым квартале амаль удалося дасягнуць. **Намеснік міністра эканомікі Дзмітрый МАТУСЕВІЧ** заявіў, што па выніках першага квартала валавому ўнутранаму прадукту (ВУП) да планавага паказчыка не хапіла ўсяго аднаго працэнтнага пункта. І гэтаму ёсць свае тлумачэнні: з-за цёплага надвор'я выкарыстоўвалася менш электраэнергіі. Да таго ж недабор ВУП па зразумелых прычынах адбыўся ад перапрацоўкі сырой нафты і вытворчасці нафтапрадуктаў. Скараціліся і аб'ёмы транспартыроўкі нафты, такім чынам, крыху прасела і транспартная галіна.

Пры гэтым намеснік міністра эканомікі адзначыў і станоўчыя моманты: з канца мінулага года стабільна працуе аграпрамысловы комплекс, штомесяц прыбаўляючы 4,5-5,5 %. Нядрэнна спрацавалі і шэраг іншых сектараў, у прыватнасці, інфармацыя і сувязь, перапрацоўчая галіна, вырасла будаўніцтва.

Як бы адрэагавала эканоміка сталіцы на каранцін, расказаў **старшыня Мінгарвыканкама Анатоль СІВАК.**

— Мы сёння маем 102 % (валавога рэгіянальнага прадукту. — **«Зв.»**), як і планавалася. А мелі б 92 %, калі б з 1 сакавіка закрылі тое, што можна было закрыць, па паўгоддзі мелі б 76 % рэгіянальнага прадукту. І атрымалі б 465 тысяч чалавек, якія былі б не заняты ў эканоміцы гэтым часам і мелі б наступствы далей, бо працэс адкрыцця складаны. У якасці прыкладу перапрафілявання бізнесу Анатоль Сівак прывёў розничны гандаль, які пачаў займацца дастаўкай тавараў.

— Уявіць сабе закрыццё вялікага горада немагчыма, бо за гэтым стаіць бюджэт, і гэта фінансаванне лячэбных устаноў, усёй сацыяльнай сферы.

**Прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Анатоль ГЛАЗ** паведаміў, што на сёння з замежных краін вывезена 7400 беларусаў. І эвакуацыя дагэтуль працягваецца. Гэта стала магчымым дзякуючы зладжанай рабоце МЗС і іншых ведамстваў, а таксама кампаніі «Белавія». Апошняя, дарэчы, пачынае аднаўляць рэйсы. Ужо распачаты авіязносіны з Рымам і Міланам, адкрыты новы напрамак Мінск—Вена. Пакуль загрузка складае каля 60 %, бо не зняты абмежаванні на ўезд. Цалкам аднавіцца авіягаліна, на думку **намесніка генеральнага дырэктара «Белавія» Ігара ЧАРГІНЦА,** зможа не раней, чым у 2021 годзе.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Італія выходзіць з каранціну



Пачынаючы з 4 мая, у Італіі паступова саслабляюцца каранцінныя меры. Па рашэнні ўрада краіны, шматлікія кампаніі аднаўляюць сваю дзейнасць. У першую чаргу гаворка ідзе пра прадпрыемствы, арыентаваныя на экспарт, — аўтапрам, славутыя італьянскія модныя дамы. Больш за чатыры мільёны італьянцаў, якія знаходзіліся дома, вярнуліся на работу. Як паведаміў прэм'ер-міністр Італіі Джузепе Контэ, краіна ўступае ў новую фазу барацьбы супраць каранавіруса. «Гаворка ідзе пра фазу, на працягу якой нам давядзецца суіснаваць з гэтым вірусам», — напісаў кіраўнік урада на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку».

### У Канадзе забаранілі штурмавую зброю

На ўсёй тэрыторыі Канады з 1 мая забаронена выкарыстанне штурмавых вінтовак і аналагічнай ім зброі. Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр краіны Джасцін Трудо. Паводле яго слоў, гэтая зброя была створана з адзінай мэтай — забіваць як мага больш людзей за кароткі прамежак часу. Усяго пад забарону трапілі 1500 разнавіднасцяў штурмавой зброі. Новы закон, які ўрад пазней мае намер зрабіць больш жорсткім, прынялі пасля самага масавага расстрэлу людзей у канадскай гісторыі. Як вядома, у ноч на 19 красавіка ў некалькіх гарадах правінцыі Новая Шатландыя 51-гадовы мужчына забіў 22 чалавекі.

### Твіт Маска абышоўся Tesla ў $14 млрд



Кіраўнік амерыканскай аўтамабілебудаўнічай кампаніі Tesla Ілан Маск напісаў у сваім «Твітары», што кошт яе акцый занадта высокі. Адразу пасля гэтага курс знізіўся, і кошт Tesla ўпаў адразу на 14 мільярдаў долараў, пры гэтым кошт пакета акцый, якім валодае асабіста Маск, скараціўся на 2,8 мільярда, паведаміла Forbes. «Мы разглядаем гэтыя заўвагі як іранічныя. Гэта проста тыповы Ілан. Яго ўмяшанне ў гэтае пытанне, вядома, непрыемнае для інвестараў. Такія паводзіны ў «Твітары» застаюцца вялікай праблемай, і на Уол-Стрыт гэтым відавочна незадаволеныя», — адзначыў агенцтву Reuters эксперт кампаніі Wedbush Securities Дэніэл Айвс.

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

6 мая 2020 г. у 14.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

75 мірных гадоў. Беларусь памятае!

# АЎТОГРАФ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

Ганаровы грамадзянін Любані пісьменнік Іван Андрэевіч Муравейка — ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Разам з намі ён сустракае 75-годдзе Перамогі. Такіх людзей, на жаль, сярод жывых засталося няшмат.

Семдзесят пяць гадоў таму чырвонаармеец беларус Іван Муравейка вывеў сваё імя на пасечанай кулямі сцяне пераможанага рэйхстага. Вызвалены Берлін заняў сваё ў вялікім шэрагу — пасля Дняпра, Днястра, Віслы, Буга, Одэра. Салдат верыў у канчатковую перамогу Міру.



— Такі я быў у сорак пятым, — паказвае Іван Андрэевіч свой партрэт.




Аўтограф-віншаванне ад Івана Андрэевіча МУРАВЕЙКІ.

Семдзесят пяты год над Беларуссю мірнае неба. Семдзесят пяты год Іван Андрэевіч прысвячае ўсяго сябе мірнай справе журналіста, пісьменніка. Яму дзевяноста восем. Самаадчуванне, як вызначае сам ветэран з уласцівым яму аптымізмам, годна адпавядае паважаному ўзросту. Такой жа аптымістычнай энергіяй вызначаны і расклад яго дня. Іван Андрэевіч па-ранейшаму плённа працуе на літаратурнай ніве, з'яўляецца аўтарам больш чым дваццаці пяці кніг прозы і паэзіі (амаль усе яны напісаныя для малодшых чытачоў). У выдавецтвах рыхтуюцца да выхаду новыя творы.

Сёлета мне пашчасціла сустрэцца з паважаным ветэранам, пабываць у яго доме. Надзвычай цікава было паслухаць успаміны, пагартаць разам архіўныя фотаздымкі. Для нас усіх ён пісаў на белым аркушы чырвоным фламастарам: «75. Мір! Віншую. І. Муравейка».

Той жа воін-пераможца, які пакінуў аўтограф у Берліне вясной 1945 года, сёння вывеў для нас дарагія кожнаму словы святочнага віншавання.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**

# КОЛЬКІ ТЫ ВІНЕН БАНКУ?

## Няпамятлівы кліент атрымлівае «чорную метку» на тры месяцы

Як вядома, пры неналежным выкананні крэдытаатрымальнікам яго абавязацельстваў банк мае права патрабаваць датэрміновага вяртання крэдыту, загадзя папярэдзіўшы яго аб гэтым. Згодна з новымі дакументамі, цяпер банк не можа запатрабаваць вярнуць усе грошы неадкладна. У крэдытным дагаворы абавязкова павінна быць замацавана права кліента вярнуць крэдыт на працягу трох месяцаў з дня атрымання адпаведнага паведамлення ад банка.

Што менавіта лічыцца неналежным выкананнем абавязацельстваў, прапісваецца ў крэдытным дагаворы з банкам. Крытэрый — гэта канкрэтны дагавор. У ім вызначаюцца абавязацельствы перад банкам, якія трэба выконваць. Калі гэтага не адбываецца, банк мае права выставіць датэрміновае спагнанне. Пры гэтым прадстаўнік Нацбанка звярнула ўвагу на тое, што за нязначныя парушэнні дагавора самім банкам нявыгадна патрабаваць датэрміновага вяртання крэдыту, таму ў банкаўскай практыцы такая мера ўжываецца, калі ёсць істотныя парушэнні крэдытнага дагавора. У першую чаргу гэта невыкананне ў тэрмін абавязацельстваў па крэдыце, непагашэнне крэдыту, нявыплата працэнтаў. Часам гэта датычыцца непрадастаўлення закладу, калі фізічная асоба абавязана даць па крэдытным дагаворы заклад у выглядзе забеспячэння.

Вольга Ілюкевіч удакладніла, што практыка датэрміновага вяртання крэдыту па патрабаванні банка існавала і раней. Норма, якая ўводзіцца з 1 мая, накіравана ў першую чаргу на тое, каб даць кліенту час на вырашэнне пытанняў з банкам, магчыма шляхам рэструктурызацыі запазычанасці, рэфінансавання крэдыту, або на пошук іншых крыніц яго пагашэння.

## Патрэбныя і даведкі, але не заўсёды

Практыка патрабавання даведкі аб даходах для атрымання некаторых крэдытаў захаваецца. Як правіла, калі гэта крэдыт на нерухомасць, на аўтамабіль і іншыя пазыкі на досыць вялікія сумы, то захоўваецца форма пацвярджэння даходаў у выглядзе даведкі.

Разам з тым, па словах прадстаўніка Нацбанка, дзякуючы развіццю тэхналогій многія банкі сыходзяць ад даведак аб зарплаце і пацвярджаюць даходы кліентаў па іншых каналах. З 1 мая ўносяцца змены ў парадак выдачы і вяртання крэдытаў. У тым ліку ўстаноўлены патрабаванні да вызначэння сярэднямесячнага даходу фізічнай асобы. Банк можа выкарыстоўваць альбо заяўны прынцып падачы інфармацыі аб даходах кліента, альбо інфармацыю, пацверджаную дакументальна.

Пры выкарыстанні заяўнага прынцыпу ў залежнасці ад віду даходу ў разлік уключаецца найменшая з наступных велічынь: велічыня даходу, указаная грамадзянінам; намінальная налічаная зарплата работнікаў па абласцях і Мінску ў залежнасці ад месца жыхарства (знаходжання) фізічнай асобы; намінальная налічаная зарплата работнікаў па відах эканамічнай дзейнасці ў залежнасці ад віду дзейнасці работніка; сярэдні памер пенсій; устаноўленая банкам велічыня даходу, якая не перавышае выпшэйпералічаныя.

Падыходы ў дачыненні да інфармацыі аб даходах (пералік і парадак падачы пацвярджальных дакументаў, пералік даходаў, падыходы да іх ацэнкі з улікам асаблівасцяў розных відаў даходаў і крэдытаў, парадак праверкі інфармацыі) устанаўліваюцца ў лакальных прававых актах банка. Як растлумачыла Вольга Ілюкевіч, раней банкі сутыкаліся з тым, што заяўлены кліентам узровень даходу не заўсёды супадаў з сапраўдным. Гэта прыводзіла да таго, што ў выніку крэдытная нагрузка для яго была празмерная.

## Ёсць і растэрміноўка

Разлік пазыковай нагрузкі таксама будзе ажыццяўляцца з улікам віду крэдыту ў адпаведнасці з зацверджанай пастановай № 100 класіфікацыяй. Пры гэтым уводзіцца новае паняцце — крэдытаванне фізічных асоб на ўмовах растэрміноўкі. Гэты від крэдытавання магчымы пры адначасовым выкананні наступных патрабаванняў:

- ёсць пагадненне паміж банкам і арганізацыяй гандлю і сэрвісу;
- крэдыт выдаецца кліенту пад працэнтную стаўку, істотна ніжэйшую чым працэнтная стаўка па крэдытах, якія даюцца банкам пры адсутнасці названых пагадненняў.

Падыходы да разліку паказчыкаў пазыковай нагрузкі і забяспечанасці крэдыту пры выдачы крэдыту на фінансаванне нерухомасці не змяніліся. Паказчык пазыковай нагрузкі не павінен перавышаць 40 %, забяспечанасці — 90 %.

❍ У тэму

### «ХАПУН» НА КРЭДЫТЫ ЎЖО СКОНЧЫЎСЯ?

Вольга Ілюкевіч заўважыла, што ў сакавіку назіраўся ўсплёск росту спажывецкага крэдытавання, і фізічным асобам было выдадзена спажывецкіх крэдытаў на суму каля 1,2 мільярда рублёў. Гэта досыць вялікая сума, прыблізна на 37 % большая, чым у лютым, што звязана ў першую чаргу з дэвальвацыйнымі чаканнямі. Але ўжо ў красавіку назіраецца істотнае зніжэнне попыту на крэдыты. Справа ў тым, што ў красавіку банкі абмежавалі прапановы па некаторых крэдытах, частка крэдытных прадуктаў прыпынена. «З боку крэдытаатрымальнікаў таксама зніжаецца актыўнасць, цяпер грамадзяне падыходзяць да атрымання крэдытаў ужо больш рацыянальна і абдумана», — дадала прадстаўнік Нацбанка.

Што датычыцца ўзмацнення жорсткасці патрабаванняў пры выдачы крэдытаў, то Вольга Ілюкевіч звярнула ўвагу на тое, што кожны банк самастойна вызначае сваімі лакальнымі актамі парадак ацэнкі крэдытаздольнасці кліента — які ўзровень даходаў у яго павінен быць. Гранічны паказчык пазыковай нагрузкі выдачы крэдыту — 40 %, але банкі могуць устанавіць і меншы памер. У цэлым, па яе ацэнцы, цяпер банкі трохі зніжаюць сваю актыўнасць у дачыненні да крэдытавання, асабліва доўгатэрміновага.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**Сяргей КУРКАЧ.**

## «Беларусь памятае. Кветкі Вялікай Перамогі»

**Пад такой назвай 5 мая ў 15.00 на сцэне Драматычнага тэатра Беларускай арміі стартуе On Air марафон «Беларусь памятае. Кветкі Вялікай Перамогі», прысвечаны 75-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Для шырокай аўдыторыі праект будзе рэалізаваны анлайн. Прамыя эфіры марафону ў інтэрнэце будуць адбывацца штодня 5—8 мая з 15.00 да 16.30. Падчас тэматычных жывых трансляцый гледачы змогуць пачуць інтэрв'ю ветэранаў, убачыць урыўкі з п'ес Аляксея Дударава «А памятаеш Алёша» і «Радавыя» ў выкананні акцёраў заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Драматычнага тэатра Беларускай арміі. Тут, на сцэне тэатра, прагучаць вершы пра вайну, а таксама песні ў выкананні артыстаў беларускай эстрады Вольгі Сацюк, Анжалікі Пушновай, Хелены Мерааі, Алены Хіта, Макса Савіна, Арцёма Міхаленкі, Івана Зданюка, Зінаіды Купрыяновіч, Данаі Шаршавіцкай, Веранікі Цубікавай, Ксеніі Галецкай, гуртоў «Правакацыя» і «Лас Вегас».

Акрамя таго, падчас эфіру запланавана работа інтэрактыўнай пляцоўкі, на якой вядучы будзе камунікаваць з гасцямі марафону.

Арганізатарамі праекта выступаюць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь і Выдавецкі дом «Беларусь сегодня».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «МОЙ ГЕРАІЧНЫ ДЗЕД!»

### Акцыя «Нашчадкі Перамогі» стартавала ў БДУ

**На працягу года на сайтах факультэтаў супрацоўнікі і студэнты ўніверсітэта будуць дзяліцца ўспамінамі пра сваіх герaічных продкаў, якія ваявалі або працавалі ў тыле падчас Вялікай Айчыннай вайны. Жанрава аўтары не абмежаваныя. У даступнай форме кожны ахвотны можа расказаць гісторыю пра сваіх блізкіх, паказаць унікальныя фатаграфіі з іх слаўтага мінулага.**

Да акцыі ўжо далучыліся прадстаўнікі факультэтаў міжнародных адносін (ФМА) і журналістыкі. Напрыклад, другакурснік ФМА Яўген Цярохін у гісторыі «Мой гераічны дзед» расказаў пра свайго дзядулю Івана Цярохіна, які 17-гадовым хлопцам трапіў на фронт. Радавым салдатам ён удзельнічаў у вызваленні Мінска, Брэсцкай, Гродзенскай абласцей, Прыбалтыкі і Усходняй Прусіі. Перамогу Іван Цярохін сустрэў у Чэхаславакіі. Усё сваё жыццё герой вайны казаў: «У нашага пакалення, якое прайшло праз агонь Вялікай Айчыннай, вайна ніколі не сатрэцца з памяці». Гэты ілюстраваны матэрыял студэнт падрыхтаваў, абапіраючыся на газетныя публікацыі пра дзядулю-ветэрана, а таксама на ўспаміны сваіх родных.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

## Цёпла і з дожджыкам

### А ў канцы тыдня ўначы слабы мінус

**У пачатку гэтага тыдня захаваецца ўплыў франтальных падзелаў, таму чакаецца няўстойлівае з дажджамі надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У ноч на сераду чарговая сістэма атмасферных франтоў выкліча на большай частцы тэрыторыі Беларусі дажджы рознай інтэнсіўнасці. У дзённыя гадзіны яны чакаюцца месцамі з навальніцамі, на захадзе краіны прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 метраў у секунду. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да плюс 11 градусаў. Удзень будзе 10—17 цяпла, месцамі — да плюс 19 градусаў.

Але камфортнае цёплае надвор'е працягнецца не доўга. Ужо ў чацвер франтальныя падзелы будуць павольна перамяшчацца на ўсход, а следам за імі чакаецца прыход больш халодных паветраных мас. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі, пераважна па паўднёвым усходзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начныя гадзіны захаваецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра панізіцца і ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 9 градусаў, удзень — 11—18 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у канцы тыдня з ростам атмасфернага ціску ападкаў прагназуецца няшмат, аднак працягнецца паступленне халодных паветраных мас. У пятніцу будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы па паўднёвым усходзе магчымы кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, пры праясненнях — да мінус 2 градусаў. Удзень будзе ўжо адносна цёпла: ад плюс 12 градусаў да 19 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДРУГОЕ «Я» АНЛАЙН



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Выраблялі і цацкі для развіцця малых:

— Нашы кліенты — юрыдычныя асобы, бюджэтнікі сферы дашкольнай адукацыі — гэта цэнтры карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі з розных куткоў Беларусі. Попыт на прадукцыю ўпаў да нуля, але калектыў не разгубіўся, не запанікаваў, — кажа Аксана пра «час цішыні», калі з пачатку лютага сціхлі тэлефоны, «завіслі» заказы. — Напрыклад, падчас крызісу, што бушаваў у 2008-м, па розных прычынах мы не маглі рытмічна папаўняць складскія запасы імпартнай прадукцыяй і паставілі сабе за мэту арганізаваць вытворчасць беларускіх цацак. Так і цяперашняя сітуацыя — гэта не толькі складанасці, але і магчымасці.

Са сваёй практыкі бізнес-стрэсаў — лічы, матыватараў — гамяльчанка дае параду іншым уладальнікам сваёй справы: скрупулёзна прааналізаваць сябе, кампанію, асяроддзе і зразумець, што трэба змяніць, каб стаць мацнейшымі за іншых на рынку.

Між тым не каманда пачала працаваць у рэжыме «вярблюда»: скарацілі арэндныя плошчы, перагледзелі ўсе выдаткі, шукаюць новыя кірункі работы і пастаянна генеруюць самыя неверагодныя ідэі. Аднак, як кажа капітан каманды, сэрца гэтага невялікага прадпрыемства — швейная вытворчасць — не перастае біцца і ганяе гарачую кроў калектыву.

— З першых дзён пандэміі мы часова перапрафілявалі сваю дзейнасць. Вырашылі запусціць лінію па пашыве бытавых ахоўных павязак. Попыт на іх быў высокі, і гэта дазволіла загрузіць нашу вытворчасць. У сярэднім у дзень адшывалі больш за дзве тысячы павязак. Каманда адміністрацыі перайшла на дыстанцыйную форму работы. Дзяўчынам-швачкам таксама прапанавалі дапамогу, каб арганізаваць для іх работу дома, але ніхто не пагадзіўся: маўляў, масак у нас хапае, санітайзеры на кожным рагу, памяшканне прыбіраюць своечасова.

Аднак попыт на бытавыя ахоўныя павязкі настолькі ўзрос, што давялося шукаць кадравы рэзерв.

— У нашай камандзе — дзве жанчыны з крытычным парушэннем слыху. Яны выдатныя майстрыхі, — з натхняючым імпэтам расказвае гамяльчанка. — Да таго ж летась мы запусцілі дабрачынны сацыяльны праект: узялі на бясплатнае навучанне кройцы і шыццю шэсць глуханямых жанчын. Так мы хацелі даць ім магчымасць атрымаць спецыяльнасць, а сабе — падрыхтаваць кадры на будучыню.

Калі пайшлі вялікія заказы на пашыў і дастаўку павязак па краіне, прадпрымальнік звярнулася да гамяльчан — прапанавала выказаць грамадзянскую пазіцыю і адначасова атрымаць работу.

— Гэта быў стыхійна напісаны пост у сеціве, але ж за два дні адгукнуліся тыя самыя жанчыны, якія навучаліся на бясплатных курсах, а ў дадатак, уявіце, яшчэ 40 гамяльчанак, — не тоіць захаплення Аксана.

Афармілі дэкларацыю, заключылі дагаворы падраду, вызначылі аб'ёмы пашыву павязак для кожнай швачкі:

— Наша прадукцыя задаволіла попыт прадпрыемстваў, арганізацый, прыватных кампаній і асобных пакупнікоў. Заказы былі самыя розныя. Знайшоў нас нават пакупнік з Ізраіля: дачка прасіла пашыць і даставіць ахоўныя павязкі для яе маці, якая жыве ў Беларусі, — дзеліцца суразмоўніца.

Звярталіся па павязкі і медыкі — ім пашытае проста дарылі.

— Я разумею, што гэты кірунак работы, па сутнасці, скончыўся для нас. Шукаем іншы і чакаем новых заказаў на нашу традыцыйную прадукцыю. Але ў дачыненні да любой сваёй справы магу параіць калегам скараціць гарызонт планавання: не бойцеся мяняць планы, не мітусіцеся і не кідайце пачатае, але шукайце, якім чынам можна выкарыстаць свае рэсурсы.

Дарэчы, сама прадпрымальнік прызнаецца, што яе каманда цяпер працуе над нечаканым праектам — гэта анлайн-школа для дзяцей. Да таго ж працягваецца актыўная работа з пачынаючымі прадпрымальнікамі ў школе «Сацыяльны прадпрымальнік», якую Аксана Шаўчэнка ўзначальвае. Яе выхаванцы ў лічаныя дні прапанавалі столькі ідэй па перапрафіляванні на работу анлайн, што прыемна здзівілі сваіх ментараў.

## Пакаранне для прагульшчыкаў...

Для заснавальніка прыватнай дзіцячай студыі танца **Алены КАЗЕЛЬКА** вымушаная работа на адлегласці — гэта не пра піжамны настрой і спрадвечную пракрастынацыю. І цяпер абавязковыя высокая прычоска і адзенне для харэаграфіі, якое не надакучыць ёй, здаецца, ніколі.

— Я займаюся з дзецьмі, якім часам няма і трох гадоў, а верхняга ўзроставага парогу ў нас не існуе. Працяглыя канікулы ў школьнікаў, потым многія засталіся на самаізаляцыі, — расказвае Алена. Яна разам з бацькамі малых вырашыла, што без анлайн-заняткаў дзеці хутка страцяць форму. — Выступленні нашага калектыву — неад'емная частка кожнага свята ў Гомелі. Спадзяемся, што так будзе і сёлета, — мы гатовыя.

У рэжыме віртуальных трэніровак тры разы на тыдзень працуюць толькі студыйцы-школьнікі. Усё разлічана на тое, каб дзеці самастойна чыталі і выконвалі заданні, калі ў бацькоў не стае магчымасці дапамагчы.

— Прыдумваю заданні, распісваю гэта ўсё, — у якасці пацвярджэння таго, што дзеці прайшлі заняткі, харэограф патрабуе дасласць хвілінныя відэаролікі: размінку, пэўныя звязкі. — Маё патрабаванне, будзеце смяяцца, — розныя шкарпэткі ў дзяцей, каб не падманвалі і займаліся штодзень. Абавязкова — форма: заплецціся акуратна, каб не было спакусы ставіцца да гэтага проста як да гульні.

Дадаткова кожны з дзяцей атрымаў творчае заданне: прыдумаць сваю кампазіцыю — танцавальную імправізацыю пад класічны музычны матэрыял у незвычайных аранжыроўках. Алена так рыхтуе сюрпрыз для бацькоў. Гэта як сачыненне напісаць: што я рабіў дома ва ўмовах самаізаляцыі. Вынік прадэманструюць пасля на справаздачным канцэрце для бацькоў.

— Мае дзяўчаты па кавалачку здымаюць сваю хатнюю рэпетыцыю і адсылаюць мне. Я кожнай потым тэлефаную, даю рэкамендацыі, звяртаю ўвагу на памылкі, — расказвае харэограф і прызнаецца, што асобныя бацькі ўсё ж такі адмовіліся ад такога фармату навучання танцам. Іх дзеці пакінулі студыю. Аднак ёсць і такія бацькі, якія захапіліся выкананнем дамашняга задання разам з дзецьмі настолькі, што самі танцуюць перад экранам.

Яны шчыра дзякуюць і за ўмение зрабіць правільную «кошку», пацягнуцца, і за ранішнія размінкі, якія, прызнаюцца, дысцыплінуюць не толькі дзяцей, але і дарослых.

— Мы ўжо вызначылі, што тэрмін у эфіры анлайн — максімум 25 хвілін, — раіць харэограф. — Калі больш, то траціцца ўвага, няма ні выніку, ні аддачы. Цяпер распрацоўваю па-



добныя, толькі гульнявыя праграмы для малых.

Паралельна Алена Казелька кіруе самадзейным народным калектывам «Віда» пры Гомельскім гарадскім цэнтры культуры. Маладая змена гартуецца з выпускнікоў яе дзіцячай студыі. На прыкладзе сваёй прыватнай справы Алена расказвае, як плануе аднаўляць работу ў дзіцячых групах і як яна спраўлялася з выплатай арэнднай платы, калі заняткі не праводзіліся:

— На працягу мінулага месяца былі абвешчаны арэндныя канікулы. Пры гэтым, наколькі я ведаю, усе гомельскія педагогі-харэографы цяпер знізілі сваю аплату на 30 %. Бо, вядома, ніхто не возьме за заняткі анлайн поўны кошт, як раней. Паступова планую пераходзіць да «жывых» заняткаў з невялікімі групамі дзяцей. З астатнімі паралельна працягнем анлайн-трэніроўкі.

> **«У дачыненні да любой сваёй справы магу параіць калегам скараціць гарызонт планавання: не бойцеся мяняць планы, не мітусіцеся і не кідайце пачатае, але шукайце, якім чынам можна выкарыстаць свае рэсурсы».**

На пытанне, чаму навучыў яе новы нечаканы фармат работы, харэограф шчыра кажа: зразумела, як цяпер караць прагульшчыкаў:

— Ніякіх больш вылікаў з абанементаў. Ім давядзецца адпрацаваць дома, зняць на тэлефон трэніроўку і даслаць відэаадпраўцоўку.

Затое для сябе яна ўпершыню за апошнія гады знайшла час перагледзець усе найноўшыя методыкі на міжнародных танцавальных сэрвісах. На гэта раней ніколі не хапала часу.

— Спісала сшытак, раблю канспекты для будучых урокаў, — дзеліцца педагог. — Аднак цалкам пераканалася, што гаджэт ніколі не заменіць настаўніку вучня, а вучню настаўніка. Вельмі цяжка, калі доўга не бачыш сваіх дзяцей, а для самых маленькіх гэта цяжэй удвая. Так што цяпер мы ў рэжыме «назапашвання абдымашак».

## Злавіць правільную злосць...

Маладая прыватная справа гомельскага трэнера па фітнесе **Святланы ХАРУЖАЙ** падчас вымушанай самаізаляцыі «стрэліла» ў лічаныя дні. Колькасць пакупнікоў яе анлайн-прадукту павысілася ў разы. Цяпер шматлікія калегі-трэнеры, што страцілі кліентаў у фітнес-цэнтрах, закідваюць яе пытаннямі і просьбамі навучыць — як?

Маючы за плячыма дыплом педуніверсітэта, навуковую ступень і «пасведчанне» фітнес-інструктара, доўгі час Святлана працавала на асноўнай рабоце ва ўстанове адукацыі. Паралельна вяла кліентаў у фітнес-цэнтры. Потым пайшла вучыцца зноў — у ГДУ імя Ф. Скарыны закончыла аддзяленне «Фізічная аздараўленчая культура». Стала інструктарам-метадыстам.

Летась вырашыла запусціць свой бізнес-праект, разлічаны на навучанне аздараўленчай гімнастыцы анлайн. Марыла працаваць з тымі, хто жыве ў розных кутках планеты.

— Я разумела, што трэба авалодаць самымі найноўшымі тэхналогіямі трансляцыі заняткаў. Пайшла вучыцца на курсы анлайн-прасоўвання свайго прадукту. Мне так шчыра і сказалі: ужывую ты выдатны трэнер, але ў сеціве ты нічто і звацъ цябе ніяк. Ды яшчэ з Гомеля — для многіх, лічы, вёска. Я вельмі раззлавалася. Вырашыла стаць самым лепшым анлайн-трэнерам як мінімум у Беларусі.

Святлана скончыла курсы, што вучаць правільна весці акаўнт у сеціве, шарсціла відэаўрокі сусветна вядомых блогераў-спартсменаў.

— Я ведала, што калі доўга буду вырашаць, то ніколі не змагу нешта стварыць сваё. Я выпусціла на рынак так званую «свінню» — інтуітыўны прадукт, але да мяне на анлайн-трэніроўкі прыйшло не менш за 500 чалавек. Паралельна працягвала працаваць з дзяўчатамі ў зале. Мая мэтавая аўдыторыя — маладыя маці, якія не маглі даць рады з жывоцікам пасля родаў. Я скампанавала ўласную методыку, дзе прафесійна спалучыла практыкаванні, якія даследавала ў сваіх навуковых работах ва ўніверсітэце, — расказвае трэнер.

Аднойчы Святлана ўсталявала ў зале камеру і пачала транслявацъ у сеціве трэніроўку сваіх дзяўчат. Да эфіру падключыліся самыя розныя жанчыны. Працаваць у такім фармаце ўсім так спадабалася, што больш на «жывыя» заняткі ніхто з гэтай групы не прыйшоў.

Цяпер па сродках відэаканферэнцыі трэніруюцца нават сем'ямі. Спажыўцы фітнес-прадукту Святланы — у асноўным жанчыны розных рэгіёнаў Расіі і Беларусі. Але ёсць прыхільнікі таксама з бліжняга і далёкага замежжа. Гамяльчанка ўпэўнена, што работа анлайн зрабіла яе новым чалавекам: эфіры на ўвесь свет выціскаюць «інфармацыйную ваду» з тлумачэнняў, вучаць быць больш адкрытым, цаніць кожную гадзіну ў сутках, а таксама загартоўваюць характар.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота з архіваў герань.**

Рух ад сэрца

# МУЗЫКА СУПРАЦЬ COVID

**Дванаццаць з паловай гадзін бесперапыннага вяшчання, каля 30 выканаўцаў, музыкантаў і іншых медыйных асоб з розных краін свету, прамая трансляцыя праз інтэрнэт і радыёстанцыі і, што самае галоўнае, не толькі маральная падтрымка, але і канкрэтная, адрасная матэрыяльная дапамога, якая накіроўвалася наўпрост на дабрачынны рахунак Віцебскай абласной клінічнай бальніцы. Так прайшоў другі дабрачынны анлайн-марафон #БеларусьБезCovid у падтрымку беларускіх медыкаў, зладжаны прадзюсарскім цэнтрам «Спамаш» пры падтрымцы Міжнароднай тэлерадыёкампаніі «Мір».**

Перадаючы адно аднаму эстафету, свае найлепшыя хіты і свежыя песні выконвалі масціты і маладыя беларускія артысты — Аляксандр Саладуха, Алена Ланская, Іскуі Абалян, Аляксей Хлястоў, гурт VAL, лідар гурта «Палац» Алег Хаменка, Іван Зданюк, беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», Саша Захарык, гурты «Радыёхваля», «Тяни-Толкай», «Дзядзька Ваня», Яўген Селязнёў, Саша Нема, Віталь Варанко, Вольга Плотнікава, Кірыл Гуд і многія іншыя. Марафон падтрымалі і іншыя медыйныя асобы, у тым ліку вядомыя спартсмены — Вадзім Дзевятоўскі, Марына Арзамасава, Дар'я Домрачава.

Што да лічбаў, то яны здзівілі нават саміх арганізатараў. Другі музычны анлайн-марафон стаў рэкордным не толькі па працягласці, але і па выніковасці — амаль штогадзіну на рахунак Віцебскай абласной бальніцы паступала некалькі тысяч беларускіх рублёў, юрыдычныя асобы і звычайныя слухачы пералічвалі грошы і набывалі спецыяльныя касцюмы і сродкі індывідуальнай абароны для медыкаў. Агульны аб'ём дапамогі шпіталю складае ўжо 40 619 рублёў — і гэта, пагадзіцеся, важкі і патрэбны дадатак да нашага агульнага «дзякуй» на адрас тых, хто на пярэднім краі барацьбы з небяспечнай хваробай.

Натхнёныя поспехам, арганізатары анансавалі, што напярэдадні Дня Перамогі, 8 мая, у 12 гадзін дня на каналах «Спамаш» і МТРК «МІР» стартуе трэці дабрачынны (і ўжо з упэўненасцю можна сказаць, што міжнародны) анлайн-марафон #БеларусьБезCovid, адрасная дапамога ад якога будзе накіравана для сталічнай 10-й бальніцы. Акрамя таго, упершыню спецыялістамі РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій будзе абвешчаны анлайн-збор даных добраахвотнікаў, якія хацелі б стаць донарамі плазмы для лячэння хворых на каранавірус.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# БЫЛІ ТАКІЯ СПАДЗЕВЫ. І ЗАСТАЛІСЯ

**...Перад Калядамі каляндар падарылі, што цалкам лагічна, — прыгожы, насценны. Карцела адразу ж распакаваць яго, прагарнуць усе дванаццаць месяцаў, ацаніць кожны з фотаздымкаў... Устрымаліся — прычакалі пачатку года, павесілі ў кухні на самым відавоку, каб потым міжволіназіраць за бегам дзён, каб не так шкадаваць, што скончыўся месяц, бо за ім — так было і так будзе — адкрыецца новы, з іншай карцінкай. А ўжо якой...**

## ВЕК ЖЫВІ, ВЕК... ЗДЗІЎЛЯЙСЯ

У цёткі Антонihі год падзелены: цёплыя месяцы яна пражывае ў вёсцы, дома, халодныя — у райцэнтры, у дзяцей, і дзе гэтай жанчыне лепей, — шчыра кажучы, не разабраць, бо гарадское жыццё кожны раз малюецца па-рознаму. Гэта значыць, калі бабуля не ў гуморы, то... у турме ёй нават цікавей было б: яна б «хоць з нейкай зэчкай днём пагаварыла!». Калі ж настрой добры — то ў дачкі дык проста рай: і чысценька, і цёпленька, і смачна, і зяць чалавек — не п'е, не курыць, зарабляе і (ці не галоўнае) у тыя доўгія зімовыя месяцы на машыне, з камфортам, возіць цешчу ў вёску — у госці да малодшай сястры, часам — нават пакідае там на дзянёчак-другі...

Сёлета на Вялікдзень яны таксама з'ездзілі: і па магілках пахадзілі (сваіх наведалі), і на сялібе ўсё праверылі — паразмаўлялі з раднёй, хоць «праз плот», бо вірус, бо ў сястры — поўная хата ўнукаў-дзяцей («з Мінска паўцякалі»)...

«Нялюдскі Вялікдзень, — па дарозе дамоў прызнала бабуля. — Такога — нават у вайну не было».

Век жыві, век... здзіўляйся.

## ТОЛЬКІ ТАК?

Горад, кавярня, і раней у абед тут досыць людна было. Цяпер вольных столікаў шмат.

За суседнім — дзеўка-прыгажуня. Сумяшчае прыемнае з... прыемным: гэта значыць, п'е гарбату з «пірожкамі» і па скайпе размаўляе з кавалерам (яна па-руску, ён па-ўкраінску). Слухаць, аб чым, вядома ж, няёмка, вушы затыкаць — таксама, і таму досыць хутка мы разумеем, што дзяўчына працуе перакладчыцай з кітайскай, што мову гэтую ведае добра, але ж сёння во «затармазіла» — пашукала ў слоўніку, як па-кітайску будзе «паўкроўка».

— Хто-хто? — перапытвае хлопец.

Дзяўчына пачынае здалёк:

— Ну, гэта калі я, беларуска, выйду замуж, дапусцім, за нейкага ўкраінца (ну хоць бы і за цябе), то нашы дзеці будуць...

— Украінцамі! — імгам сцвярджае хлопец.

— Але ж не чыстымі, — настойвае дзяўчо, — а якраз паўкроўкамі.

— Не-е!.. Прабач! Мае дзеці — з кім ні ажанюся — будуць украінцамі. Ты зразумела?

Дзяўчына ўсміхнулася, развяла рукамі. Не прыдумала, што сказаць? Ці, можа, згадзілася?

...Да слова: калегі неяк у адно з нашых мястэчак у госці патрапілі, пасядзелі за сталом, на экскурсію схадзілі: здавалася, усё агледзелі. Аж не: ад мясцовага дзеда пачулі, што паблізу ёсць вельмі старыя могілкі — рускія, польскія і яўрэйскія. «А беларусы на якіх хаваюцца?» — спыталі старога. «Беларусы — не паміраюць», — не разгубіўся той.

Адкуль — не нараджаюцца? Не паміраюць?

«Хаваюцца»?

## ПЫТАННЕ

Вялікі горад — вялікі магазін, і як некалі — дык шматлюдны. Цяпер (беражонага бог беражэ) народу вобмаль, чэргаў амаль няма — хіба ля кас, невялічкія, — з пяці-дзесяці чалавек.

У суседняй, паблізу, многія ў масках (а хто-ніхто яшчэ і ў пальчатках), усе трымаюць дыстанцыю. Гэта, здаецца, ужо за правіла, хоць, як водзіцца, не для ўсіх: адна з пакупніц, спытаўшы апошняга, можна сказаць, лезе яму на плечы, што і раней было б непрыемна, а ўжо зараз...

Не дзіва, што той апошні робіць крок наперад, паварочваецца тварам да жанчыны і моўчкі, адной левай (працягнутай) «адганяе» яе на бяспечнае месца...

Шкода, што, адагнаць — не азначае паставіць, бо цётка ўжо з адлегласці пачынае даводзіць, што ўсё гэтыя «сядзі дома» ды «маску надзень» — як мёртваму прыпарка, што каму лёс памерці ад віруса, той усё роўна памрэ, а каму не — той выжыве...

«Забойная» логіка: паводле яе, смерць наканаванная ўсім, а каму-нікаму — яшчэ і правы яе прыспешваць?

## ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Нехта недурны прызнаў, што мабільнік выбіраеш як жонку: хочацца, каб магла — ну ўсё чыста, а потым карыстаешся парайтройкай функцый.

Галоўная з іх — не вам казаць — магчымасць пазваніць.

І, магчыма, тады, гартаючы старонку кантактаў, зноў «зачапіцца» за прозвішчы-імёны тых, хто ўжо сышоў, хто ніколі і нікому ўжо не адкажа; падумаць, што трэба было б навесці парадак — выдаліць непатрэбныя нумары...

Нам — нейчыя.

Некаму — потым — нашы.

Казаць так лягчэй, а вось не бегчы, не даганяць часам складана. Асабліва — «лёгкім на пад'ём» дзяўчатам, жанкам.

Мужчынам, мусіць, прасцей: яны рэдка бегаюць (у прыватнасці, за трамваем), аднак з імі таксама здараецца.

Адзін вось запыхаўся, пад музыку са свайго мабільнага ўскочыў у салон, «У-у-у, б...!» — сказаў на адрас таго, хто восъ так недарэчы звоніць... І тут жа, прыклаўшы смартфон да вуха, залапатаў: «Так, любімая... Як скажаш, любімая... Усё зраблю... І я цябе цалую».

Ад любові да нянавісці, кажуць, адзін крок.

А назад — не меней?

## БУТЭЛЬКА БОЛЬШАЯ...

З дыялогаў (бальнічных): «Ратуйце, доктар! Нешта ў бок дужа коле!» — «Напэўна, дабрыня?» — «З чаго б?!» — «Ну вы ж ведаеце: яна заўсёды бокам вылазіць».

Гэта — анекдот. Зараз — чыстая праўда.

Дзень, праспект, падземны пераход. На прыступках — жанчына з працягнутай рукой, але не сядзіць, як іншыя (моўчкі, з пакорай), а стаіць... Ды што там — нават кідаецца да прахожых з гучным «Па-дай-це!»...

Адмаўляць неяк не выпадае: на хаду выцягваем з кішэняў па колькі манет, даём.

— Мала! Давайце яшчэ! — заступіўшы дарогу, патрабуе жанчына.

— ?!

— У вас жа ёсць! Ну...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЯГАДКІ БУДУЦЬ ПОТЫМ

...На тыя клумбы пад вокнамі звычайнага шматкватэрнага дома мы натрапілі выпадкова і, што называецца, завіслі, прычым надоўга. Нас, жанчын, больш цікавіла, што цвіце і што яшчэ будзе, мужчын — сама «пабудова».

Яе, як і ўсякую іншую, пачыналі, відаць, з праекта, з малюнкаў на паперы, а потым на зямлі.

Далей была закладка «падмуркаў», на якіх з круглых каменьчыкаў «выраслі» акуратныя «сценкі» і невялічкіх высакаватых клумбаў, і трохі большых ніжэйшых, раз'ядналых вўхлістымі сцежкамі-мураванкамі.

Часу і сіл на гэтыя работы, пайшла, відаць, процьма (гэта ж столькі камення назбіраць!..), плюс затраты на цэмент, кусты спірэі і барбарысу, дэкаратыўныя травы, кветкі-шматгадовікі, грунт...

Але ж затое потым...

Потым, без сумневу, ўсё акупілася, папершае, рэдкім харастом і акуратнасцю, падругое, зручнасцю ў доглядзе, па-трэцяе...

Летась на адной з невялічкіх клумбаў цудоўна цвілі... кабачкі, на другой — памідоры, ад чаго агульнае ўражанне зусім не псавалася. Хутчэй, наадварот.

## АД І ДА

З правіл жыцця: ніколі не даганяй ні трамвай, ні каханне, якое сыходзіць, — будуць новыя.

Толькі цяпер заўважаем (у пабірачкі на твары напісана), што грошы ёй патрэбны зусім не на ежу ці лекі — на выпіўку. Прычым патрэбны так, што ўжо не сорамна не толькі прасіць, а нават вымагаць...

Некалі даўно ў рукі трапіў цікавы ліст. У пачатку яго дзесяцігадовы хлопчык пісаў бацькам, што ў інтэрнаце жывецца нядрэнна (умольнае «мамачка, забярыце мяне адсюль» было ў канцы), што кормяць добра, што навучылі працаваць з пластылінам і што ён вылепіў цэлую карціну: і бацькоў, і дзядзьку Юзіка, і шклянкі з бутэлькай, і хлеб... Аднак твор яго настаўніца не ўхваліла: сказала, што бутэльку ён вылепіў няправільна, што яна — завялікая, большая за людзей, што восъ так у жыцці не бывае...

Трэба разумець, маладая была настаўніца, новенькая ў школе-інтэрнаце, бо старэйшыя, напэўна ж, ведалі, што ўсё на «карціне» правільна, што бывае так, і, на жаль, вельмі часта.

## ПАД ВІРУСАМ

Вечарам цяпер трамваі амаль пустыя: можна ехаць стоячы, можна — седзячы (нават на адлегласці), аднак гэта, што называецца, пры жаданні. У нейкага відавочна нездаровага (ці п'янаватага?) дзядзькі яго няма, бо, уваліўшыся ў салон, ён літаральна павісае над адзіночным бакавым сядзеннем, над худзенькай пажылой жанчынай.

Тая (не ў турме, відаць, гадаваная) спрабуе неўпрыкмет адсунуцца, «урасці» ў сядзенне. Потым, зразумеўшы марнасць сваіх патуг, пакорліва ўстае — ідзе на выхад. Іншыя пасажыры едуць далей, ужо, праўда, убачыўшы, для чаго нам патрэбен каранцін.

## СЯРОД ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

У жыцці чалавека шмат прыгожых, памятных дат: дзень народзін у 16, у 25... У 33, 55, 77 (калі дажывеш).

Дзеду Мацвею 88, і ён іх вельмі годна сустрэў: на сваіх нагах, пры памяці, хоць, здараецца, яна і падводзіць. Напрадвесні восъ ранічкай доўга збіраўся, у краму выйшаў і амаль дайшоў — успомніў, што мабільнік забыў. «Вяртацца, — падумаў, — благая прыкмета. Ды і каму я зранку патрэбен? Ніхто ж не будзе званіць».

Таму дзед спакойна прайшоўся па гандлёвай зале, выбраў сабе што трэба, разлічыўся. На вуліцы яшчэ знаёмца сустрэў — разам працавалі, праўда, у мінулым стагоддзі, даўно, але ж усё роўна ёсць што ўспомніць, аб чым пагаварыць.

З паўгадзіны на лаўцы сядзелі — на першым сапраўдным сонейку грэліся. Маглі б і даўжэй, але той знаёмец у цырульню спяшаўся. «Во, а мне ж таксама добра было б пастрыгчыся», — падумаў дзед, але наважыўся туды не адразу: апошнія гадоў з дзесяць дачка яго стрыгла — сама. Дзеду падабалася: ні табе ісці куды, ні потым грошы плаціць... Зараз — хіба за кампанію?

Удвух з тым знаёмцам яны дайшлі да цырульні, пачакалі адзін аднаго, пастрыгліся, потым збочылі яшчэ на рынак — прыцаніліся да гароднін...

Дамоў дзед вяртаўся добра стаміўшыся і бліжэй пад абед. Здалёк яшчэ ля свайго пад'езда згледзеў ладную купку людзей. Падумаў, што яны, відаць, таксама на сонца выйшлі — вясна...

Факт, што дзед не здзівіўся, а восъ яму...

— Паўлавіч?! Ты? Жывы-здаровы? — зашумелі суседзі. — А мы ж не ведалі, што і думаць, што рабіць! Тэлефоны твае маўчаць, абодва — і хатні, і мабільны, у дзверы званілі — таксама ніхто не адгукаецца... Думалі, ты ўжо таго — самую цяжкую работу зрабіў, з жыццём развітаўся... Хацелі дзецям тваім званіць, дзверы ўзломваць, грошы збіраць...

«І яны ж маглі, — дабраўшыся да сваёй канапы, падумаў Паўлавіч (і потым сваім расказаў...). — Дружны пад'езд — нічога не скажаш: людзі збольшага пажылыя, добрыя... Значыць, нельга без мабільніка з дому выходзіць, бо наступны раз прывалачэшся, недзе затрымаўшыся, а пад дзвярыма ўжо і труна стаіць».

## ВЫЛЕЧАЦЬ...

Зарадкай у многіх дамах-кватэрах займаюцца хіба тэлефоны. У гэтым — яшчэ і дзед з бабуляй: штовечар, у любое надвор'е, яны выходзяць на прагулкі, а каб «мазгі не ржавелі», разгадваюць розныя рэбусы ды тэсты-крыжаванкі.

Сярод любімых — «кіношныя». Спытайце, з якога фільма «Нашы людзі ў булачную на таксі не ездзяць», «У цябе ўсё па правілах, а бываюць яшчэ і выключэнні», «Птушачку шкада», «Гані рубель, сваяк!..» ды многае іншае — могуць пакрыўдзіцца, бо гэта ж як двойчы два.

...З яшчэ прасцейшага крылатае: «І цябе вылечаць... І цябе таксама вылечаць... І мяне...»

Былі такія спадзевы.

І засталіся — не захварэць.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж.** Кажуць, у аднаго празорцы на дзвярах «офіса» красавалася аптымістычнае, што ўсё напрыканцы будзе добра, а калі не (нядобра — пакуль), то гэта — яшчэ не канец.

І сапраўды, працяг будзе.

# ДЗЕ ГЭТА ВУЛІЦА, ДЗЕ ГЭТЫ ДОМ?

## Адказ ведае УКБ Ленінскага раёна Мінска

**Узвядзенне дамоў, будаўніцтва вуліц, транспартных развязак, інжынерных сетак, капітальны рамонт Тэатра юнага гледача, Лошыцкага палаца культуры, бальніц, школ... Усё гэта — справа рук спецыялістаў Упраўлення капітальнага будаўніцтва Ленінскага раёна Мінска, якім горад давярае стварэнне, рамонт і ўдасканальванне многіх сталічных аб'ектаў.**

### Усё, што трэба гораду

Працы хапае рознай. Нават калі будуецца невялікі дом, каля яго прадугледжана стварэнне пешаходных і веласіпедных дарожак, падключэнне да камунікацый, арганізацыя праездаў. Падчас ушчыльнення забудовы ўпарадкуюць і прыдамавую тэрыторыю. І за ўсім гэтым трэба сачыць, каб у час і дакументацыя была гатовая, і работы ад графіка не адставалі, і матэрыялы своечасова паступалі.

У асноўным УКБ будуе жыллё непавышанай камфортнасці — як «панэлькі», так і каркасныя канструкцыі, у тым ліку для шматдзетных сем'яў. У канцы 2019-га вось такі дом здалі. А ў жніўні будзе скончаны 336-кватэрны «камерцыйны» будынак. Цана на нерухомасць пры продажы ў такім доме фарміруецца на рынку жылля. Каркас будынка — з бетону, запоўнены газасілікатнымі блокамі, ёсць падземная стаянка. Кватэры тут будуюцца без унутранага аздаблення, аднак усе інжынерныя сеткі да памяшканняў праведзены і ўсталяваны батарэі.

Сёлета збіраюцца пачаць будаваць яшчэ два дамы для тых, хто мае патрэбу ў жыллі.

— *З 2020-га па рашэнні Мінгарвыканкама ўсе дзяржаўныя забудоўшчыкі пачнуць будаваць жыллё толькі для тых, хто мае ў гэтым патрэбу. Але ж мы можам рабіць усё, што трэба гораду,* — **расказаў Сяргей МІРГАЛОЎСКІ, дырэктар УКБ Ленінскага раёна Мінска.**

### Школы, дарогі, паліклінікі

Увесь план забудовы мікрараёнаў Лошыца-7 і Лошыца-5 распрацоўвала УКБ. Цяпер спецыялісты заканчваюць дарожную і сеткавую інфраструктуру ў мікрараёнах Лошыца-7, Лошыца-8.1, Лошыца-8.2, Лошыца-5. Гэта каля чатырох кіламетраў, на працягу якіх пракладваюцца інжынерныя сеткі, робіцца асвятленне, арганізоўваюцца наземныя і падземныя пешаходныя пераходы, веладарожкі згодна з тэхнічнымі ўмовамі.

— *Капітальна рамантуем таксама аб'екты культуры і аховы здароўя, навучальных устаноў. Рэканструюем 6-ю цэнтральную раённую клінічную паліклініку Ленінскага раёна. Летась скончылі цепламадэрнізацыю 134-й гарадской школы. Цяпер тое ж самае робім у 123-й школе: уцяпляем фасад, мяняем вокны, страху. Да 1 верасня справімся.*



Мікрараён Лошыца-9.
Будоўля школы і дзіцячага садка.

— *Ужо пачынаем работы трэцяй чаргі, на якія адведзены год. Тут запланаваны капітальны рамонт з поўным перааснашчэннем — заменай мэблі, абсталявання. Распрацаваны праект на капрамонт паліклінікі № 18, які мяркуем распачаць у 2021-м. Амаль скончана распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі на капрамонт дзіцячых садкоў № 262, № 446, № 195. У апошнім, магчыма, нават пачнём работы да канца гэтага года.*

### Дзіцячы садок вырастае за год

Са жніўня 2019-га ўпраўленне будуе ў Лошыцы-9 два сацыяльныя аб'екты: школу і дзіцячы садок у межах тэрыторыі вуліцы Прушынскіх. У новым мікрараёне ўжо дзевяць шматкватэрных дамоў, яшчэ два здадуць да канца года, і гэта не ўсё. Таму сацыяльных аб'ектаў тут вельмі не хапала. Акрамя садка і школы ў план на перспектыву ўнесены яшчэ адзін дзіцячы садок на 130 месцаў.

— *У трохпавярховы садок № 574, што будуецца, восенню ўжо пойдуць першыя выхаванцы. Будаваць яго пачалі ў жніўні, цяпер заканчваюць апошні паверх. Паралельна набіраюць штат супрацоўнікаў, а дзеці тут, мяркуючы па абсталяванні груп, будуць напоўніцу рыхтавацца да школьнага жыцця,* — падзяліўся **інжынер тэхнагляду УКБ Ленінскага раёна Іван КАПУРА.**

Гэта будзе сучасны аб'ект на 230 месцаў з басейнам, харэаграфічнай залай, камп'ютарным класам, пунктам карэкцыйнай педагагічнай дапамогі. На вуліцы змесцяцца 12 гульнявых пляцовак (для кожнай з груп), а таксама пляцоўка для вывучэння ПДР, а колер садка будзе гарманіраваць з афарбоўкай найбліжэйшых дамоў, дзе жыве мноства шматдзетных сем'яў.



Галоўны інжынер УКБ Ленінскага раёна Зоя СТАРАЖЭНКА і галоўны інжынер СУ № 94, ААТ «Будтрэст № 1» Дзяніс ПОВАД кантралююць будоўлю дзіцячага садка і школы ў мікрараёне Лошыца-9.



Дырэктар Сяргей МІРГАЛОЎСКІ з начальнікам аддзела перспектыўнага праектавання Таццянай СІДАРАВАЙ і намеснікам дырэктара Сяргеем САРАКАЧОМ абмяркоўваюць план пабудовы новых аб'ектаў у Ленінскім раёне.

### Тры гектары для вучняў

У мікрараёне Лошыца-9 побач з садам узводзяць школу, будаўніцтва якой разлічана на 1,5 года. Займацца тут будуць 1020 вучняў. Нягледзячы на тое, што аб'ект па сучасных мерках лічыцца тыпавым школьным будынкам, яго напаўненне і памеры ўражваюць. Пад школу і яе навакольную інфраструктуру адведзена тры гектары.

— *Карпусы аб'екта ў розных узроўнях: тры блокі па тры і чатыры паверхі. Асобным будынкам робіцца басейн, які будзе яднацца са школай галерэяй на ўзроўні другога паверха,* — апісаў будучую ўстанову **Дзяніс ПОВАД, галоўны інжынер БУ № 94 будтрэста № 1.** — *Тут будзе і поўны набор спартыўнага абсталявання, неабходнага для развіцця школьнікаў. Адкрыты стадыён на вуліцы з трыбунай на 600 месцаў, пляцоўка для бадмінтона, вывучэння ПДР, валейбола, баскетбола, хакейная каробка. Унутры — спартзала, асобная гімнастычная зала, зала для аэробікі, трэнажорка.*

Пакрыццё стадыёна і бегавых дарожак, дарэчы, будзе ўжо не асфальтавае, а спецыяльнае гумавае, паўпрафесійнага ўзроўню. Тут можна будзе без праблем арганізоўваць спартыўныя міжшкольныя спаборніцтвы. Завершаць школу на пачатку 2021-га. Тэрыторыю ўпрыгожаць вечназялёныя дрэвы і малыя архітэктурныя формы.

*А летам плануем пачаць работы і ў школе № 164,* — падзяліўся Сяргей Міргалоўскі. — *У школах у залежнасці ад заказу робіцца як капітальны рамонт, так і толькі цеплавая рэабілітацыя. Раней практыкаваўся рамонт з адначасовым навучаннем, цяпер гэтага няма. Усе вучні на час рамонту пераходзяць у іншыя навучальныя ўстановы раёна. Паліклінікі рэканструюем паэтапна: закрываем адно крыло і выконваем усе работы, затым — наступнае.*

Работы ў шостай паліклініцы, напрыклад, разлічаны на чатыры этапы. Першая, другая і чацвёртая (добраўпарадкаванне) чэргі ўжо выкананы. Засталося рэканструяваць трэцюю чаргу — левы блок, удакладніў **Сяргей САРАКАЧ, намеснік дырэктара:**

**Ірына СІДАРОК,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



Супрацоўнікі вытворча-тэхнічнага аддзела на чале з начальнікам Ірынай ДАШЧЫНСКАЙ, вядучым эканамістам Эльвірай КАМАЛАВАЙ, вядучымі інжынерамі-каштарыснікамі Таццянай ДРОБАТ і Валянцінай ЖЫТКОВАЙ.

### Была сядзіба — стала кватэра

Мікраераён пачынаецца з дарог. Прынамсі, такім чынам ствараецца сталічная Лошыца-9, вакол якой спачатку сіламі УКБ яшчэ ў 2015-м арганізавалі магістральныя сеткі: водаправод, каналізацыю, ліўневую сістэму і дарогі. А ўжо пасля пакрысе тут сталі ўздымацца дамы, якія і далучалі да камунікацый.

— *Будавалі вуліцы Пташука, Турава, рэканструявалі вуліцу Лучыны. Такім чынам закальцавалі мікрараён дарожнай інфраструктурай,* — падзялілася **Зоя СТАРАЖЭНКА, галоўны інжынер УКБ Ленінскага раёна.** — *Рабілі працяг вуліцы Лучыны, у мікрараёне Лошыца-8 збудавалі вуліцы № 3, № 7 і № 8. Цяпер робім магістральную вуліцу Праектуемая № 1 (3-е кальцо). Шырыня яе амаль 75 метраў і кіламетр у даўжыню. Тут будзе па тры паласы ў абодва бакі, а паабапал — пешаходныя і веладарожкі, зялёная зона. Апошняя атрымалася досыць вялікая, бо тут калісьці меліся пракласці трамвайныя пуці, ад чаго пасля адмовіліся.*

Завершаны праектныя работы па вуліцы Праектуемая № 5, Праектуемая № 6, якія ідуць вакол мікрараёна Лошыца-5. Рэканструявалі частку вуліцы Чыжэўскіх, а працягваць яе, згодна з планам, маюцца па месцы прыватнай забудовы, якая ператворыцца ў мікрараён Лошыца-5. І ў гэтым плане ўпраўленне сутыкаецца з асобнай і вялікай часткай работы.

— *Мы павінны рэалізаваць маёмасныя правы ўласнікаў падвор'яў і прапанаваць ім пераехаць у жыллё адпаведных памераў ці забраць кампенсацыю за сваю нерухомасць, згодна з Указам № 58,* — падзялілася **Таццяна КОТ, вядучы юрыст УКБ Ленінскага раёна**. — *Жыллё ацэньваецца па рыначным кошце, і калі розніца паміж цаной кватэры і дома пад знос на карысць апошняга, то ўласнік атрымае і кватэру, і розніцу наяўнымі. У Лошыцы ёсць не толькі сядзібы, але і двухпавярховыя дамы — у іх кошт, вядома, значна меншы.*

Падчас рэалізацыі маёмасных правоў памер кватэры, якая прадастаўляецца ўзамен прыватнага дома, разлічваецца зыходзячы з агульнай плошчы дома ўласніка або ў залежнасці ад колькасці зарэгістраваных і пражываючых членаў сям'і (па 15 м$^2$ на чалавека). Калі людзей шмат, то адна сям'я ў выніку можа рассяліцца і па розных кватэрах, што для многіх вельмі зручна.

— *Амаль усё прыватнае жыллё ў гэтым месцы ўжо ў такім стане, што прызнана аварыйным. Там ёсць дамы, якім больш за 100 гадоў,* — дадала Зоя Старажэнка. — *Ужо па метках зацверджанага плана будаўніцтва не атрымліваецца захаваць гэтыя домаўладанні на месцы, як бы каму ні хацелася. Тым больш што вельмі складана будзе ўвязаць сеткі, што пракладваюцца, з існуючым прыватным домам, бо дыяметр камунікацый розніцы значна большыя маштабы.*

Да канца лета ва УКБ спадзяюцца ўжо атрымаць праект на забудову Лошыцы-5.

УНП 190583113

**АДКРЫТАЕ АКЦЫЯНЕРНАЕ ТАВАРЫСТВА «БЕЛЭЛЕКТРАМАНТАЖНАЛАДКА» вядзе адлік сваёй гісторыі з 1964 года. На той час тут працавала 25 чалавек. Прадпрыемства было арыентавана на правядзенне пусканаладачных работ, пры будаўніцтве электрастанцый.**

**Цяпер гэтае шматпрофільнае прадпрыемства з асабістымі канструктарскай, вытворчай і выпрабавальнай базамі ўваходзіць у склад Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белэнергабуд» – кіруючая кампанія холдынга. Прадпрыемства неаднаразова заносілася на Дошку гонару Ленінскага раёна, у 2014 годзе ўзнагароджана Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за высокія тэхніка-эканамічныя паказчыкі, значны ўнёсак ва ўкараненне найноўшых дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу ў энергетыку Беларусі. А генеральны дырэктар акцыянернага таварыства Сяргей АЛЯХНОВІЧ стаў лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Чалавек справы — 2016».**


Дыспетчарскі пункт Пінскага прадпрыемства электрасетак.

# ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ АЙЧЫННАЙ ЭНЕРГЕТЫКІ

## У СКАРБОНКУ ЭКСПАРТУ ПАСЛУГ

— У нас назіраецца рост па ўсіх паказчыках. У параўнанні з 2018 годам, у 2019-м рост вытворчасці прадукцыі склаў 104,9 %. Значна павялічыўся і экспарт паслуг: пры плане 36 мільёнаў 16 тысяч долараў ЗША мы зрабілі 47 мільёнаў 861 тысячу долараў. Такі рост адбыўся за кошт таго, што мы з 2015 года задзейнічаны на будаўніцтве Беларускай атамнай электрастанцыі ў Астраўцы. На гэтым аб'екце наша прадпрыемства цалкам выконвае мантажныя работы па электрычнай частцы машынных залаў абодвух блокаў, — расказвае Сяргей Мікалаевіч. — У скарбонку экспарту паслуг зрабіла свой унёсак наша структурнае падраздзяленне «Упраўленне будаўніцтва атамнай станцыі». Дарэчы, на вытворчай базе Беларускай АЭС арганізаваныя адміністрацыйны блок, бытавы гарадок, складскія памяшканні, працуе спецыялізаваная тэхніка. Кіраўніцтва гэтага падраздзялення, а менавіта начальнік Уладзімір Палын, яго намеснік Міхаіл Казак і начальнік участка Сяргей Мамыш, пастаянна знаходзіцца на пляцоўцы. Гэтыя людзі, можна сказаць, у эпіцэнтры падзей, дасканала валодаюць усімі праблемамі і па меры сіл і магчымасцяў вырашаюць іх непасрэдна на аб'екце. Ёсць у нас і падраздзяленне, якое займаецца парадныкамі пусканаладачнымі работамі на АЭС. Бясспрэчна, яно таксама паўплывала на павелічэнне экспарту паслуг.

Вельмі істотную долю адыгрывае **упраўленне перспектыўнага развіцця (УПР) пад кіраўніцтвам Сяргея КАРАЛЁВА**. Гэта інжынірынгавае падраздзяленне, якое займаецца распрацоўкай і вытворчасцю высокатэхналагічнага, імпартазамяшчальнага абсталявання і тэхналогій для патрэб энергетыкі, прамысловасці і камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Асноўным кірункам дзейнасці УПР з'яўляецца распрацоўка і вытворчасць мікрапрацэсарных ахоў, блокаў сілкавання і вымяральных прыбораў для падстанцый 6—110 кВ. У межах праграмы лічбавізацыі эканомікі краіны яно вядзе распрацоўку і ўкараненне прылад для арганізацыі лічбавых падстанцый. Адным з найважнейшых кірункаў дзейнасці ўпраўлення з'яўляецца яго ўдзел у праграме аўтаматызацыі размеркавальных электрычных сетак. Для гэтай праграмы УПР распрацоўвае і выпускае як элементы кіравання (мікрапрацэсарныя аховы, індыкатары току кароткага замыкання, кантралёры кіравання, блокі сілкавання), так і рэклоўзеры 6—35 кВ. УПР больш за 20 гадоў займаецца ўкараненнем сістэм гарадскога асвятлення, ілюмінацыяй і падсветкай буйных гарадоў Беларусі, такіх як Мінск, Магілёў, Ліда, Бабруйск. Сістэма кіравання гарадскім асвятленнем цалкам распрацавана на тэхнічных і праграмных сродках ААТ «Белэлектрамантажналадка».

## ЗНАЧНЫЯ ПРАЕКТЫ ДЛЯ БЕЛАРУСІ

«Белэлектрамантажналадка» рэалізавала і рэалізуе шэраг значных для Беларусі праектаў. У прыватнасці, прадпрыемства валодае вопытам уладкавання ветраўстановак. У якасці генпадрадчыка яна выступіла на будаўніцтве ветраэнергетычнага парка непадалёк ад Навагрудка. Гэта першы ў краіне аб'ект такога кшталту. Вядома, быць першапраходцамі заўсёды складана. Пры мантажы ветраэнергетычных установак сюрпрызы


Генеральны дырэктар ААТ «Белэлектрамантажналадка» Сяргей Мікалаевіч АЛЯХНОВІЧ.

падносіла надвор'е. Паколькі гандолу масай 60 тон нельга паднімаць для ўстаноўкі на верх вежы пры хуткасці ветру, вышэйшай за восем–дзевяць метраў за секунду, то давялося прымаць нестандартныя рашэнні, якія дапамаглі выдатна справіцца з сітуацыяй. Вага адной канструкцыі ВЭУ — 200 тон. Для надзейнага замацавання давялося заліць маналітны жалезабетонны фундамент. Гэты працэс адбываўся бесперапынна на працягу 14 гадзін. А справіцца неабходна было з пяццю такімі ўстаноўкамі. Агульная магутнасць ветраэнергетычнага парка складае 9 МВт. Гэта дазволіць цалкам забяспечыць электраэнергіяй Навагрудак пры намінальным ветры 10 метраў за секунду.

У Чэрыкаве па праекце прадпрыемства **(падраздзяленне праектных работ, начальнік Андрэй ТРЭМБІЦКІ)** узводзіцца сонечная электрастанцыя. Яе магутнасць — 109 МВт. Яна будзе самая магутная ў Беларусі. Разам з кітайскай кампаніяй CITIC таварыства стварае высокатэхналагічную аграпрамысловую вытворчасць поўнага цыкла ў Рудзенску Пухавіцкага раёна — цяпер вядзецца першая чарга будаўніцтва.

Яшчэ адзін значны аб'ект, да якога мае непасрэдныя адносіны «Белэлектрамантажналадка», — завод па вытворчасці металічнага ліста і белай бляхі, што ўзводзіцца ў Мёрах Віцебскай вобласці разам з кампаніяй «Мінскпрамбуд». Спецыялісты займаюцца наладжваннем электразабеспячэння цэхаў, вытворчасцяў. Унікальнасць праекта — у выпуску прадукцыі, прынцыпова новай для Беларусі, краін СНД, блізкага замежжа. Гэтае прадпрыемства, чакаецца, стане горадаўтваральным для райцэнтра.

Акрамя таго, «Белэлектрамантажналадка» з 2018 года ў якасці субпадрадчыка вядомай кампаніі RIKO робіць лічбавую падстанцыю «Магілёў-330». Яна з'яўляецца адной з базавых падстанцый у айчыннай энергетычнай сістэме, якая знаходзіцца ў цэнтры нагрузак і забяспечваеператокі электраэнергіі з Лукомльскай ДРЭС на Гомельскі і Жлобінскі энергавузлы. Падстанцыя адыгрывае значную ролю ў электразабеспячэнні буйных спажыўцоў беларускай энергасістэмы: ААТ «БелАЗ», «Магілёўхімвалакно», «Магатэкс», «Сервалюкс», «Строммашына» і іншых.

— Гэта дазволіць сэканоміць пэўную колькасць кабельнай прадукцыі, таму што лічбавізацыя не патрабуе абмену аналагавымі сігналамі, — уводзіць у курс справы Сяргей Аляхновіч. — Такога класа падстанцыя будзе адна з першых у краіне. Сёлета плануем закончыць першы пускавы комплекс, а налета аб'ект плануецца ўвесці ў эксплуатацыю. На гэтай пляцоўцы працуюць два нашы падраздзяленні — **упраўленне мантажных работ на чале з Аляксеем УЛЕЙЧЫКАМ і ўпраўленне наладачных работ (начальнік Віктар ГУСАЧОК)**. Яны спраўляюцца з пастаўленай задачай і таксама робяць унёсак у экспарт паслуг — каля 11 % ад агульнага аб'ёму.

— У Беларусі распрацавана таксама праграма па ўстаноўцы воданагравальных катлоў з мэтамі рэгулявання мінімальнай і максімальнай магутнасці энергасістэмы пасля ўводу ў дзеянне БелАЭС, — працягвае Сяргей Мікалаевіч. — Летась мы пачалі займацца гэтай тэмай, выступаем генпадрадчыкам па раённых кацельнях «Паўночная» ў Віцебску, «Паўднёвая» ў Брэсце, Салігорскай, Маладзечанскай міні-ЦЭЦ з устаноўкай электракатлоў. Гэтым займаюцца нашы структурныя падраздзяленні — упраўленне мантажных работ, упраўленне наладачных работ і ўпраўленне вытворчасці прадукцыі, якое ўзначальвае Віктар Іванавіч Зубрыцкі. Мы выкарыстоўваем тэхніку, якую распрацавалі і выпускаем на сваёй базе. Яна запатрабавана не толькі на нашых аб'ектах, але і на іншых, якія працуюць па гэтай тэматыцы. У далейшым будзем развіваць і ўдасканальваць тэхніку з улікам патрабаванняў па электраспажыванні.


Супрацоўнікі ААТ «Белэлектрамантажналадка» *(справа налева)*: начальнік участка праектных работ Андрэй ТРЭМБІЦКІ, галоўны інжынер праекта Алена БЫКАВА, інжынер па падрыхтоўцы вытворчасці Настасся БУЛАТАВА, інжынер-праекціроўшчык 1-й катэгорыі Аляксей СТАНАВЫ, начальнік сектара праектавання АСК і сувязі Анатоль ІВАНЮКОВІЧ, начальнік каштарыснадагаворнага сектара Рустам КАСТОЕЎ.


Спецыяліст капіравання і пераплёту праектнай дакументацыі Вольга ЯЦЭНКА.

## БУДУЧЫНЯ ЗА АЎТАМАТЫЗАЦЫЯЙ

— На сучасным этапе праводзяцца работы па аўтаматызацыі размеркавальных сетак з сярэднім класам напружання — да 35 кілавольт, — працягвае размову **начальнік участка АСУ Алег КОЗІК.** — У энергасістэме іх, як правіла, абслугоўваюць раённыя электрасеткі. На цяперашні момант там вельмі старое абсталяванне, якое патрабуе мадэрнізацыі. У рэчышчы гэтых патрабаванняў ідзе абнаўленне абсталявання і аўтаматызацыя. Кіраваць сістэмай павінны праграмныя прадукты ў аўтаматычным рэжыме — аўтаматычна лакалізаваць пашкоджанні, рабіць разнастайныя задачы, каб пры аналізе мы бачылі, дзе і што адбылося, і хутка ліквідаваць непаладкі. Наша арганізацыя займаецца аўтаматызацыяй з 1990-х гадоў. Тады працэс быў працёмкі. Цяпер будуем больш складаную схему з аўтаматычным кіраваннем, апавяшчэннем спажыўцоў. У цяперашні час ідзе рэалізацыя праекта ў Пінскіх сельскіх раённых электрасетках. Справа рухаецца да заканчэння. У 2019 годзе завяршыўся буйны праект па аўтаматызацыі размеркавальных сетак Барысаўскага РЭС Барысаўскіх электрасетак. Гэтая сістэма ўжо ўведзена ў работу.



— Аўтаматызацыя размеркавальных сетак — адзін з перспектыўных кірункаў, якімі займаецца прадпрыемства, — тлумачыць **намеснік начальніка ўпраўлення перспектыўнага развіцця Уладзімір НЯЧАЕЎ.** — Мы прадстаўляем арганізацыю, якая ў межах выканання праектаў па аўтаматызацыі займаецца ўсімі відамі работ — ад праектавання да вырабу абсталявання, яго мантажу і наладкі. Стараемся цалкам выкарыстоўваць толькі абсталяванне асабістай распрацоўкі, асабістай вытворчасці. У нас ёсць тэрытарыяльна-вытворчыя ўчасткі — Мінскі, Белаазёрскі, дзе выпускаецца абсталяванне для аўтаматызацыі — ад тэрміналаў мікрапрацэсарных ахоў да канцавога абсталявання.

Аўтаматызацыя стварае зручнасці для спажыўцоў, а эксплуатуючыя арганізацыі не трацяць дадатковых сродкаў для вышуку месцаў пашкоджання электрычных сетак. Аўтаматыка дазваляе аператыўна вырашыць праблему, з мінімальнымі затратамі і ў сціслыя тэрміны ліквідаваць непаладкі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

УНП 100101011.

# «ЭЛЕКТРОННАЯ ШКОЛА» Ў ЛОШЫЦЫ-4

## Віртуальны музей, скаладром, дзень самакіравання і ўрокі праз Skype

**Сустрэцца разам — удача, супрацоўнічаць разам — поспех. Гэта дэвіз сталічнай сярэдняй школы № 51, якую шэсць з паловай гадоў таму ўрачыста адкрываў Прэзідэнт Беларусі. Установа стала адным з першых удзельнікаў праекта «Электронная школа» і з самага пачатку працуе на платформе schools.by.**



У кожнага навучэнца школы ёсць электронная картка вучня, якая з'яўляецца не толькі пропускам ва ўстанову, але і банкаўскай карткай, электронным фармулярам для школьнай бібліятэкі, даведкай для праезду ў транспарце, а таксама выкарыстоўваецца для аплаты харчавання ў сталоўцы.

Апошнія пяць гадоў у школе не карыстаюцца папяровымі дзённікамі.

— *Электронны дзённік забяспечвае адкрытасць адукацыйнага працэсу, дазваляе мець больш стасункаў з навучэнцамі і бацькамі ў віртуальнай прасторы,* — расказала **дырэктар школы № 51 Галіна ЧЭРНІК.** — *Бацькі праз электронны дзённік атрымліваюць актуальную інфармацыю пра паспяховасць сваіх дзяцей, а ў вучняў развіваецца адказнасць за свае дзеянні і рашэнні.*

На сайце школы створаны віртуальны метадычны кабінет, дзе можна пачытаць афіцыйныя дакументы, якія датычацца навучальнага працэсу, знайсці шмат карыснай інфармацыі, атрымаць парады псіхолага. А ў конкурсе Ленінскага раёна на лепшы смарт-кабінет для пакалення XXI стагоддзя школа заняла першае месца.

— *Мы актыўна развіваем і ўжываем інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (ІКТ) у навучальным працэсе. На працягу двух гадоў мы рэалізоўвалі праект «Перавернуты ўрок» як механізм павышэння якасці адукацыі навучэнцаў,* — падзялілася дырэктар. — *За гэты час настаўнікі навучыліся як выкарыстоўваць ужо гатовыя сэрвісы Google і Web 2.0, так і ствараць свае электронныя прадукты на платформах Kahoot, Quizizz, Quizalize, Triventy, ZipGrade і многіх іншых.*

У цяперашніх няпростых умовах 1324 вучні з 50 класаў і 90 педагогаў не маюць праблем з навучаннем і працуюць праз платформы Skype, Zoom, google-дыск.

— *Дамашнія заданні з прымацаванымі неабходнымі файламі: прэзентацыямі, навучальнымі відэаролікамі, тэставымі заданнямі з лёгкасцю адпраўляем праз інтэрнэт. Выкарыстанне лічбавых сэрвісаў для атрымання зваротнай сувязі ад школьнікаў робіць працэс навучання больш дынамічным, інтэрактыўным і прадукцыйным,* — удакладніла Галіна Чэрнік.

Ва ўстанове мноства спартыўных гурткоў: футбол, баскетбол, настольны тэніс і нават скаладром. Для пяцікласнікаў сёлета з'явіўся профільны спартыўны клас па баскетболе, а таксама магчымасць вывучаць у гуртку кітайскую мову.

У 51-й школе, пэўна, адзінай у краіне, існуе віртуальны музей тэхнікі і электронікі. У ім тры залы, дзе прадстаўлены гісторыя стварэння тэхнікі, гісторыя электрычнасці розных перыядаў і найноўшыя тэхналогіі. Ёсць і інтэрактыўны лазерны цір, які актыўна выкарыстоўваецца як у шосты школьны дзень, так і для заахвочвання вучняў, якія сталі першымі ў пэўных спаборніцтвах.

Нягледзячы на малады ўзрост, школа стварае свае традыцыі. Двойчы на год — увосень і на Каляды — ладзяцца дабрачынныя кірмашы, сродкі ад якіх пераводзяць на рахункі дзіцячых дамоў або сацыяльна-педагагічных цэнтраў. Традыцыяй стаў і калядны канцэрт. А на Дзень настаўніка абавязкова праходзіць дзень самакіравання, калі вучні старэйшых класаў выкладаюць урокі ў малодшых, пасля чаго кажуць, што іншымі вачыма паглядзелі на прафесію настаўніка.

**Ірына СІДАРОК.**

# Горад расце ў горадзе

**Пагаварылі журналісты «Звязды» з кіраўнікамі Ленінскага раёна Мінска і аб яго перспектывах. Звязаны яны перш за ўсё з шырокім вядзеннем будаўніцтва жылля і сацыяльных аб'ектаў. Тлумачэнні дае намеснік кіраўніка адміністрацыі Вольга РУСІНОВІЧ, якая адказвае за групу эканамічных пытанняў.**



— Асноўнай перспектыўнай пляцоўкай для будаўніцтва аб'ектаў, у тым ліку жылля, на тэрыторыі нашага раёна з'яўляецца жылы раён Лошыца, які будзе развівацца з улікам забудовы мікрараёнаў Лошыца-5, 7, 8, 9, 10.

**У Кітаі пяцідзённыя вакацыі з нагоды Першамая. Жыхары Паднябеснай з асцярожнасцю, але ўсё ж такі выправіліся ў падарожжы па краіне. Падчас доўгачаканых свят больш за чатыры тысячы турыстычных зон па ўсёй КНР даступныя для наведванняў. Пра гэта інфармагенцтву Xinhua паведамілі ў адным з вядучых кітайскіх анлайн-турагенцтваў Trip.com Group. Кітайцы актыўна замаўляюць білеты ў цікавыя мясціны (іх, паверце, у Паднябеснай нямала), значна выраслі продажы пакетаў турпаслуг, якія ўключаюць у сябе пражыванне ў гасцініцах і наведванне славутасцяў. Ужо і не верыцца, што яшчэ тры месяцы таму сітуацыя ў краіне была зусім іншая. Як Паднябеснай удалося ўтаймаваць COVID-19?**



### «ПРЫЙДУ ДА РАКІ І ЗАКРЫЧУ»

Кітайскі горад Ухань, адкуль пачалася эпідэмія каранавіруса, з 23 студзеня быў на строгім каранціне. Насамрэч, улічыўшы экстрэмальную сітуацыю (як заўважаюць спецыялісты, краіна фактычна выпрабавала свае магчымасці ва ўмовах біялагічнай атакі), кітайскія ўлады пайшлі на беспрэцэдэнтныя меры, якія спачатку былі ахарактарызаваны СААЗ як «дзіўныя». Амаль тры месяцы ўся 60-мільённая Хубэй — адна з цэнтральных правінцый КНР — знаходзілася ў поўнай ізаляцыі. Цягнікі і авіярэйсы былі адменены, а на дарогах з'явіліся кантрольна-пропускныя пункты. Розныя абмежаванні былі ўведзеныя і ў іншых частках Кітая.



Група навукоўцаў з Кітая, ЗША і Вялікабрытаніі прыйшла да высновы, што жорсткі каранцін, уведзены ва Ухані ў самым пачатку пандэміі, дазволіў прадухіліць да 700 тысяч выпадкаў заражэння і значна затармазіць распаўсюджванне інфекцыі. Даследаванне было апублікавана ў часопісе Science. Па словах навукоўцаў, каранцін ва Ухані дазволіў іншым гарадам КНР выйграць каштоўны час для падрыхтоўкі ўласных абмежавальных мер.

8 красавіка 11-мільённы мегаполіс зноў вярнуў сваім жыхарам і гасцям, якія міжволі заселі тут, свабоду перамяшчэнняў. Цяпер тут працуе грамадскі транспарт, адкрыты аэрапорты, а месцічы нарэшце атрымліваюць асалоду ад фірменнай уханьскай локшыны на свежым паветры. Вяртаюцца ў ранейшае дававірусная жыццё і іншыя кітайскія гарады.

— Увечары 30 сакавіка нам сказалі, што жыхарам нашага кампаўнда (жылога комплекса. — ***«Зв.»***) будзе дазволена выйсці на дзве гадзіны па пакупкі. Я была так усхвалявана, што расплакалася. Апошні раз пакідала свой дом 16 лютага, і з тых часоў прайшло ўжо 43 дні. Хтосьці аднойчы спытаў мяне: «Што ты будзеш рабіць у першую чаргу пасля заканчэння блакавання?» Я сказала: «Прыйду да ракі і закрычу», — напісала 31 сакавіка 29-гадовая жыхарка Уханя Го Цзын, якая стала інтэрнэт-славутасцю пасля таго, як пачала весці анлайн «Дзённік Уханьскага каранціна».

Як заўважыў кіраўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрас Адханом Гебрэесус, паспяховы вопыт Уханя ў барацьбе з каранавірусам дазваляе спадзявацца на перамогу над пандэміяй ва ўсім свеце.

### РОБАТЫ Ў ДАПАМОГУ

Падчас эпідэміі ЦК КПК і Дзяржсавет аператыўна стварылі Цэнтральную кіруючую групу па барацьбе з каранавірусам. Яе ўзначаліў старшыня Дзяржсавета Лі Кэцян.

Аднак найбольш важныя рашэнні прымаў асабіста старшыня КНР Сі Цзіньпін. Паніку ў самай вялікай па колькасці насельніцтва краіне свету ўдалося стрымаць дзякуючы выразна агучанай уладай стратэгіі, «зялёнаму калідору» для імпарту неабходных медыцынскіх тавараў. Дарэчы, вытворчасць многіх з іх кітайцы ў сціслыя тэрміны арганізавалі ўнутры краіны. Акрамя гэтага, яны прымудрыліся з рэкордней хуткасцю ўзвесці некалькі велізарных медыцынскіх комплексаў на тысячы месцаў і арганізаваць работу навуковага сектара для вывучэння віруса.

Пандэмія каранавіруса яскрава прадэманстравала эфектыўнасць крызісных мадэляў дзяржаўнага кіравання. Эксперты заўважаюць, што ў Кітаі перайшлі да мабілізацыйнай эканомікі. Дзяржава кантралявала як крамы, так і анлайн-дастаўку прадуктаў, што дазволіла не дапусціць павышэння цэн. Эфектыўна спрацавала сістэма анлайн-сэрвісаў. Кітай прыкметна пашырыў дзяржаўныя інтэрнэт-платформы.

Акрамя поўнага перакрыцця эпіцэнтра хваробы, каранціну і паўсюднай праверкі тэмпературы грамадзян, важную ролю ў вайне з вірусам адыграў хай-тэк. Як адзначыла Xinhua, тэхналогіі штучнага інтэлекту, прапанаваныя кітайскімі навукоўцамі, у поўнай меры адыгралі ролю дадатковых медыцынскіх рэсурсаў. «Код здароўя» можа візуальна адлюстроўваць траекторыю перамяшчэння карыстальніка і яго кантакты з людзьмі, што робіць гэтае ноу-хау добрым памочнікам, які дазваляе пазбегнуць рызыкі заражэння. Акрамя таго, інфрачырвонае цеплавізійнае вымярэнне тэмпературы цела, аналіз вялікіх даных і іншыя тэхналогіі паказваюць сваю здольнасць ў розных кірунках і дапамагаюць навуцы ажыццяўляць прафілактыку і кантроль за насельніцтвам. Воблачныя тэхналогіі актыўна выкарыстоўваліся вытворчымі кампаніямі, а таксама навучальнымі ўстановамі.

Робаты-афіцыянты ў рэстаранах і гатэлях, беспілотныя машыны на вуліцах, робаты-кур'еры службы дастаўкі на вынас, а таксама паветраныя лагістычныя беспілотныя лятальныя апараты сталі ў Паднябеснай незаменнымі памочнікамі ў складаны час. Гэтую тэму актыўна абмяркоўвалі СМІ і сацсеткі. Напрыклад, амерыканскі тэлеканал CNBC пахваліў кітайскіх робатаў за тое, што яны праявілі свае «звышздольнасці» падчас эпідэміі.

### ТРЫ ЛІНІІ АБАРОНЫ

У канцы сакавіка старшыня КНР Сі Цзіньпін правёў пасяджэнне Палітбюро ЦК КПК па рэагаванні на COVID-19 і пытаннях эканомікі. Цяпер перад Кітаем стаяць дзве асноўныя задачы: прадухіленне завозных выпадкаў каранавіруса і ўзнікнення другой хвалі эпідэміі ў Кітаі, а таксама аднаўленне эканомікі краіны. Гэтыя праблемы ўзаемазвязаны, бо актыўны ўздым пагражае паўторам эпідэміі, таму робіцца жорсткія прэвентыўныя захады, каб пазбегнуць такога развіцця падзей.

Кітай стварыў тры «лініі абароны» для прадухілення «імпарту» новых выпадкаў каранавіруснай пнеўманіі з-за мяжы, паведаміў эпідэміёлаг У Цзунью з Кітайскага цэнтра па прафілактыцы і кантролі за захворваннямі. На перадавой лініі знаходзяцца мытнікі, якія выявілі нямала хворых пасажыраў шляхам вымярэння тэмпературы цела, а таксама з дапамогай праверкі гісторыі іх перамяшчэнняў.

Другая лінія абароны заключаецца ў двухтыднёвым карантыне, які павінны адбыць усё, хто прыбывае ў Кітай з-за мяжы. На трэцяй лініі абароны знаходзяцца вопытныя медработнікі. Штодня па ўсёй краіне праводзіцца каля мільёна бясплатных тэсціраванняў на каранавірус.

Паводле афіцыйнай статыстыкі, эканоміка Паднябеснай скарацілася ў першым квартале на 6,8 працэнта. Аб'ём ВУП правінцыі Хубэй абваліўся на 40 %. Зразумела, немалую частку ўдару прыняў на сябе Ухань — адзін з вядучых аўтамабільных цэнтраў Кітая і буйны хаб у галіне высокіх тэхналогій, які займаў у давірусныя часы дзявятае месца ў рэйтынгу самых высокаэфектыўных гарадоў краіны.

— Поўная блакіроўка дзелавой актыўнасці ў лютым і частковае блакіраванне ў сакавіку прывялі да таго, што ВУП Уханя скараціўся на 70 і 50 працэнтаў адпаведна. Страты за два месяцы (у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года) ацэньваюцца дзесьці ў 800 мільярдаў юаняў, або крыху менш за 120 мільярдаў долараў, — ацаніў маштаб бедства прафесар эканомікі ўханьскага ўніверсітэта навукі і тэхнікі Хуачжун Чэнь Бо для сайта iz.ru.

Вярнуцца да ранейшага паказчыка ВУП, па яго словах, сталіца правінцыі Хубэй зможа ўжо налета — за кошт абяцанага стымулявання мясцовай эканомікі цэнтральным урадам. На самастойнае ж аднаўленне эканамічнага росту пайшло б мінімум два гады, што, дарэчы, пацвярджае прыклад Гуанчжоў, які быў эпіцэнтрам успышкі атыповай пнеўманіі ў 2003-м.



### «МАТРЫЦА» АДНАЎЛЯЕЦЦА

Кітайская эканоміка пачынае хутка аднаўляцца. У Паднябеснай нават спадзяюцца на новыя магчымасці, якія адкрыў крызіс. Для пераадолення наступстваў і аднаўлення ўлады распачалі маштабныя меры. Народны банк Кітая знізіў рэзервовыя патрабаванні да банкаў, што вызваліць 550 мільярдаў юаняў (больш за 77 мільярдаў долараў) на падтрымку эканомікі.

Вельмі сур'ёзна паніжаны падаткі, перш за ўсё на малы і сярэдні бізнес. Банкі абавязаны прыпыніць спагнанне выплат па крэдытах. Вызваленыя ад падатку на дабаўленую вартасць кампаніі, якія працуюць у інтэрнэце. Грашыма стымулюецца стварэнне новых анлайн-платформаў. З фонду сацыяльнага страхавання прадпрыемствам кампенсуюць выплаты па заробках у перыяд прастою.

Пераканаўшыся ў тым, што дзяржава не кінула іх у перыяд крызісу, кітайцы з энтузіязмам вяртаюцца на работу. У грамадстве пануюць пазітыўныя настроі ад паспяховага пераадолення пандэміі. Гэта важкі дадатковы стымул для развіцця эканомікі, чаканняў і планаў інвестараў. Велізарныя перавагі абяцаюць Кітаю (найбуйнейшаму ў свеце імпарцёру вуглевадародаў) танныя нафта і газ. Гэтая акалічнасць дае Паднябеснай дадатковыя магчымасці для набыцця актываў па ўсім свеце.

Урад Кітая заяўляе, што, паколькі на першы квартал прыпадае невялікая доля гадавога ВУП (у лютым — пачатку сакавіка традыцыйна падае актыўнасць у сувязі з тым, што маштабна адзначаецца свята Вясны), страты будуць хутка кампенсаваны за кошт назапашанага попыту і інтэнсіўнага аднаўлення вытворчасці. Зноў пачынаюць працаваць буйныя прыватныя прадпрыемствы. Напрыклад, кампанія Tesla ўжо ў канцы лютага адкрыла завод у Шанхаі і аб'явіла аб планах па пашырэнні вытворчых магутнасцяў.

Дадатковы стымул для развіцця атрымаў інтэрнэт-гандаль, бо жыхары Паднябеснай у перыяд каранавіруснай эпідэміі пераважна заказвалі тавары праз сусветнае павуціннe. Урад Кітая робіць актыўныя захады з мэтай аднавіць вытворчасць на мясцовых заводах. Былі прыняты меры па аказанні дапамогі галінам, якія найбольш моцна пацярпелі ад абмежаванняў падчас барацьбы з каранавірусам. Асаблівы ўхіл робіцца на сектар 5G у спадзяванні, што сеткі новага пакалення стануць каталізатарам росту.

Індыкатарамі ўздыму кітайскай эканомікі служаць фінансавыя рынкі. Павышаюцца індэксы Шанхайскай біржы (Shanghai Composite), а таксама Шэньчжэньскай (Shenzhen Composite) і ганконгскай (Hang Seng). Растуць у цане акцыі найбуйнейшых кітайскіх кампаній. Напрыклад, у плюсе China Petroleum & Chemical, CNOOC (Кітайская нацыянальная шэльфавая нафтавая карпарацыя). Выраслі каціроўкі акцый Geely Automobile Holdings, China Life Insurance. Кітайская «матрыца» аднаўляецца, і гэта дае надзею ўсёй сусветнай эканоміцы.

**Захар БУРАК.**

# ВЯРТАННЕ Ў БОЖЫ ДОМ

## Як Іван Кірчук ікону з Радзівонішак выратаваў



У такой прыгожай царкве сёння моляцца прыхаджане.

**Калі глядзіш на ікону Іаана Хрысціцеля, якая ўпрыгожвае храм Успення Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Радзівонішкі, што на Лідчыне, стаіш нібыта заварожаны. Яе прыцягальная сіла вымушае задумацца пра нешта надзвычай важнае, незямное. І нават не быўшы знаўцам іканапісу, разумееш: ікона мала падобная на тыя, што вісяць побач. Яна знаходзіцца тут паўтара стагоддзя — з моманту заснавання царквы. Як і гэты Божы дом, ікона прайшла няпросты шлях, пакуль не толькі заняла прыгожае месца ў храме, але і назаўсёды засталася ў душах людзей, якія па сённяшні дзень звяртаюцца ў малітвах да Іаана Хрысціцеля.**



Валянціна РЫХЛІЦКАЯ зберагла ікону Іаана Хрысціцеля.

### ПЯСОЧНІЦА НА КАСЦЯХ

Радзівонішскую царкву прыхаджане пабудавалі ў 1869 годзе. Чатыры гады мясцовыя жыхары вазілі на конях чырвоную цэглу, цягалі з чыгункі чорнае каменне, майстравалі купалы, рабілі з яек фарбу, пісалі іконы, размалёўвалі сцены, шылі царкоўнае ўбранне — узвядзенне храма для многіх з іх стала справай усяго жыцця.

Намоленае месца ў Радзівонішках існавала дагэтуль, але невялікая ўніяцкая каплічка ўжо не адпавядала інтарэсам праваслаўнай часткі хрысціян. Калі пабудавалі царкву, уніяцкую капліцу раскідалі, застаўся толькі крыж. Акурат на тым месцы маладыя бацькі зрабілі для сваіх дзяцей пясочніцу. Толькі не для гульні было гэтае месца: дзеці тут то рукі-ногі ламалі, то ні з таго ні з сяго галовы білі.

— Яшчэ мой сын хадзіў у школу ў 1980-я гады, як там, дзе стаяла капліца, пачаліся раскопкі, — расказвае мясцовая жыхарка Валянціна Рыхліцкая, якая прыслужвае ў Радзівонішскай царкве. — Знайшлі чатыры чалавечыя чэрапы, на калах іх насілі. Магчыма, каля капліцы хавалі бацюшкаў. Што было потым, не ведаю — хутчэй за ўсё, іх парэшткі ляжаць там дагэтуль.

### АДНЫ ЗНІШЧАЛІ, ДРУГІЯ ЗБЕРАГЛІ

Такое дзікунства ў дачыненні да святых месцаў магло адбывацца толькі за савецкім часам. Мала што тлуміліся з чалавечых астанкаў, дык яшчэ спрабавалі знішчыць і царкву, якую людзі ўзвялі за ўласныя грошы сваімі ж рукамі. Аказваецца, такое суседства не падабалася дырэктару школы, якая акурат стаяла насупраць храма. Людзі ведалі гэта, таму пільнавалі, каб камуністы не разрабавалі царкву. Але дырэктар ці хтосьці іншы з яго падачы ўмудраўся выкручваць ікону, якая вісела на варотах пры ўваходзе ў храм. Забяруць ікону і кінуць на падворак дзеду, які прыслужваў бацюшку. Стары яе падрамантуе ды зноў павесіць на месца.

Канчаткова дырэктар школы разззлаваўся, калі даведаўся, што бацюшка патаемна пахрысціў дзяцей адной настаўніцы. Тады разам з мясцовымі ўладамі было прынята рашэнне святога айца выгнаць, а царкву зачыніць.

— Я працавала ў школе прыбіральшчыцай, — згадвае Валянціна Васілеўна. — Бачу, спыніўся каля царквы невялікі «казялок». Выйшлі людзі, распілавалі жалезную штабу, бо замок не атрымалася, і ўвайшлі ў храм. Затым пад'ехала калгасная грузавая машына, і ў прычэп пачалі кідаць харугвы, іконы, іншыя царкоўныя рэчы. Праўда, за царскія вароты не пайшлі. Затое дабралася туды старшыня сельскага савета...

Менавіта з дазволу гэтай жанчыны і быў учынены гвалт над царквой. Супадзенне гэта ці не, але лёс у яе склаўся трагічна: жанчына разам з мужам загінула ад рук свайго зяця. А мужчына, які дапамагаў знішчаць царкоўную маёмасць і казаў: «Калі ёсць Бог, няхай мяне пакарае» — праз некалькі гадоў трапіў у аварыю. Выжыў, але на ўсё жыццё застаўся калекам. Можна сказаць, пашанцавала настаўніку фізкультуры, якому даручылі спілаваць крыж. Мужчына адмаўляўся, але яго пагражалі звольніць са школы. Усё роўна нічога не атрымалася: толькі ён дакрануўся пілою да крыжа, як інструмент ламаўся.

Усё, што ў той дзень (а было гэта восенню 1960 года) выносілі з царквы, кідалі ў машыну неахайна. Іконы, святыя кнігі, іншыя царкоўныя рэчы людзі выцягвалі літаральна з-пад колаў. Акурат адтуль падабрала аблічча таго самага Іаана Хрысціцеля і Валянціна Рыхліцкая. Прынесла ікону ў хату, нягледзячы на забарону, павесіла яе на самае бачнае месца і шанавала амаль сорак гадоў, пакуль святыня не вярнулася ў храм.

Дзякуючы неабыякавым людзям пасля адраджэння царквы ў 1998 годзе іконы, святыя кнігі, царкоўнае ўбранне зноў апынуліся ў Божым доме. Але каб раней знайшлося яшчэ крыху больш настойлівасці, веры, то такога гвалту над святыняй не адбылося б. Царкву не трэба было пільнаваць ад рабавання, і ўе трэба было проста хадзіць. А людзі баяліся. «Не патрэбна вернікам — значыць, спатрэбіцца нам», — думалі камуністы і рабілі сваю справу. У суседняй вёсцы Лебяда, што за некалькі кіламетраў ад Радзівонішак, царкву ніхто не чапаў. Нават у такі складаны час там вяліся набажэнствы — не існавала «зброі» супраць сапраўднай веры.

### ВЯРТАННЕ «МАЦІ БОЖАЙ»

У пачатку сямідзясятых у Радзівонішках пачалі будаваць новую школу. Улетку прараб браў з сабой на будоўлю сына-падлетка. У той дзень з імі ў вёску прыехаў яшчэ і сынаў сябар. Пакуль бацька быў заняты справай, хлопцы не знайшлі лепшай забавы, як праз невялікае акенца залезці ў зачыненую царкву. На царскіх дзвярах яшчэ вісела некалькі ікон. Сярэдзіна храма за час забыцця ўвалілася, таму туды, акрамя гэтых цікаўных хлапчукоў, ніхто не лазіў. Вынесшы з храма дзве іконы (сын прараба ўзяў «Маці Божую», а яго сябар «Георгія Пераможца»), хлопцы таемна прывезлі іх дамоў у Ліду.

З таго часу прайшло шмат гадоў. Людзі зноўку свабодна наведвалі храм у Радзівонішках, не баяліся адзначаць праваслаўныя святы. Акурат на адно з іх — на Раство Хрыстова — у хату да Валянціны Рыхліцкай завіталі нечаканыя госці. Жанчыны дома не было, але родныя потым расказалі ёй пра падарожнікаў, а галоўнае — паказалі прынесеную імі «Маці Божую», якая, здавалася, бясследна знікла з царквы. Разам з іконай падарожнікі пакінулі Валянціне Васілеўне ліст, у якім расказалі пра лёс святыні пасля таго, як яна аказалася па-за сваім домам.

У сына прараба была набожная бабуля — праўда, каталічка. Дзякуючы ёй ікону ў хаце шанавалі. Хлопца бласлаўлялі ёй, калі той ішоў у армію. Потым «Маці Божая» вісела ў мінскай кватэры маладога мужчыны, калі ён адвучыўся, стварыў сям'ю, стаў славутым артыстам. Сёння Іван Кірчук, той самы падлетак, а цяпер лідар этнатрыа «Троіца», ледзь не штолета прыязджае ў Радзівонішкі, каб пакланіцца іконе, якая за гэты час стала для яго вельмі каштоўнай.

Апроч царквы, вядомы артыст не мінае і хаты Валянціны Рыхліцкай. Ён часта расказвае, што ў той дзень, як яны з маці неслі ікону, надвор'е было кепскае. Калі ж «Маці Божая» аказалася ў Валянціны Васілеўны, засвяціла сонейка. Ікону забралі ў царкву падчас хрэснага ходу. Такой урачыстасці ні дагэтуль, ні пасля хата гаспадыні ніколі не бачыла — чалавек 50 сабралася! Сімвалічна, што вярнулася ў свой дом «Маці Божая» акурат у вялікае праваслаўнае свята — Узвядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы.

### «ЗАЎЖДЫ ДАПАМАГАЛА МАЛІТВА...»

Адбудоўваць храм пачалі ў 1991 годзе. Як і больш чым сто гадоў таму, царква была аднаўлена людскімі сіламі. І ў верасні 1998 года прыхаджане праз доўгі час зацішша сабраліся на першую службу. Шмат сярод іх было добраахвотнікаў, якія падымалі храм з руін, але галоўным падзвіжнікам падчас аднаўлення царквы, безумоўна, стала Валянціна Рыхліцкая.

— Я з малых гадоў расла пры царкве, — згадвае жанчына. — Мой дзед у суседніх Бабрах быў старастам пры царкве, а маці з маёй сястрой хадзілі на клірас спяваць. А тут, у Радзівонішках, прыслужвала ў царкве мая бабуля па бацькавай лініі. Каб я расказала, што мне давялося перажыць, запісаць не хапіла б кнігі «Ціхі дон». За некалькі кіламетраў басанож хадзіла ў школу, а ў 1947 годзе, калі бацька прыйшоў з фронту, мы згарэлі. У хаце пяцёра дзяцей, малодшай — усяго два тыдні... Адным словам, у найбольш складаных момантах мне заўжды дапамагала малітва.

Нягледзячы на свой паважаны ўзрост, Валянціна Васілеўна кожную суботу першая ідзе да царквы. Пакуль на ранішняе набажэнства збяруцца вернікі, яна навядзе тут парадак, абагрэе храм, упрыгожыць яго кветкамі. Дзякуючы настаяцелю прыхода протаіерэю Мікалаю Ахотніцкаму стала прыгожа і ўтульна каля самой царквы. Нясмела, але сюды едуць людзі і з іншых вёсак. Зноў настаў час, калі толькі вера, самая шчырая малітва дапамогуць перажыць усё ліхое.

**Вераніка КАНЮТА, фота аўтара.**



Так выглядала царква ў першыя гады свайго існавання.



Унутры храма пасля таго, як над царквой быў учынены гвалт.

Радавод

# СПРАВЫ СЯМЕЙНЫЯ

## Як разблытаць клубок памяці?



**Збіраць і захоўваць памяць аб продках можна па-рознаму. Тут мала проста знайсці імёны і скласці сямейнае дрэва — важна разабрацца з тым, кім былі нашы продкі, што любілі, што ім не падабалася, чым займаліся, якія наказы пакідалі малодшым пакаленням. Нездарма на Беларусі шанавалі продкаў, верылі, што яны прыглядаюць за намі, дапамагаюць. Сямейныя гісторыі могуць аб'яднаць сваякоў, даць падказкі, як паводзіць сябе ў складаных сітуацыях альбо пазбегнуць пэўных памылак.**

### ЧЫМ ЗАНЯЦЦА НА ІЗАЛЯЦЫІ

Перш чым выправіцца ў архіў і паглыбіцца ў мінулае, важна не забыць пра тых, хто побач. І нават калі з-за каранавіруса вы сёння пазбягаеце сустрэч са сваімі бабулямі і дзядулямі, не палянуйцеся лішні раз парадаваць іх званком. Падказаць тэму для гутаркі могуць старыя фатаграфіі — распытайце, хто на іх, калі і што адбывалася. Важныя не толькі імёны — спытайце пра гісторыю старых рэчаў, якія ўжо доўгія гады захоўваюцца ў сям'і, запішыце сямейныя традыцыі, рэцэпты, песні ці казкі, паданні, прыпеўкі, што чулі ад бабулі. Калі нейкія старыя прадметы, напрыклад, мэблю, зробленую рукамі дзядулі, няма магчымасці далей захоўваць, хоць бы сфатаграфуйце іх. Карысна запісаць інтэрв'ю з людзьмі сталага веку на дыктафон — гэта ж не толькі ўспаміны, але і думкі, характар, маўленне блізкага вам чалавека.

Усе гэтыя дэталі могуць спатрэбіцца, калі вы захочаце аформіць свае даследаванні ў такія модныя сёння кнігі па гісторыі роду. Яны могуць стаць цудоўным падарункам на юбілей, вяселле, іх можна перадаць нашчадкам. Уявіце: калі вы сёння толькі распытаеце ў бабулі пра яе маці і бабулю, то сваім унукам вы перадасце ўжо радавод, сабраны ажно да шостага калена!

Пагартайце сямейныя фотаальбомы (рабіце надпісы з адваротнага боку), карысная інфармацыя можа быць на паштоўках і ў кнігах (напрыклад, дарчыя надпісы). Праверце, ці захаваліся старыя дакументы, нататнікі, дзённікі, выразкі з газет, якія збіралі вашы бацькі і дзяды. Там могуць быць як публікацыі пра сваякоў, так і матэрыялы, якія вашым родным здаваліся важнымі. Так праз сям'ю можна вывучаць гісторыю краіны.

### ДЗЕ ШУКАЦЬ

Пачніце ствараць радавод з сябе. Накідайце першыя імёны: бацькі, дзеда, дзядзькі, стрыечных... Занатоўвайце гады жыцця, месцы жыхарства, прафесіі, цікавыя факты з біяграфіі, сямейныя легенды. Калі нейкая інфармацыя невядомая, пазначайце яе пытальнікамі. Усе недакладнасці і недахопы ў вашых запісах — падказка, пра што ў будучым можна будзе распытаць сваякоў.

Для навічкоў працуюць анлайн-школы, што вучаць весці генеалагічныя пошукі, прыгожа і цікава падаць сабраную інфармацыю.

Калі ў вас пакуль няма магчымасці пагутарыць з роднымі людзьмі, кіньце кліч у інтэрнэце. Магчыма, хтосьці з вашых далёкіх сваякоў ці землякоў ужо працуе з патрэбнай вам інфармацыяй. Пошук можаце весці на адпаведных сайтах, прысвечаных генеалогіі, і ў сацыяльных сетках (існуюць суполкі па прозвішчах і населеных пунктах). Цяпер некаторыя архівы зрабілі доступ да сваіх матэрыялаў бясплатным.

Паспрабуйце знайсці сваякоў, з якімі былі страчаны кантакты альбо пра якіх вы даведаліся выпадкова. Магчыма, у сям'і захаваліся старая перапіска, паштоўкі, нататнікі, у якіх пазначана, дзе тыя жылі. Паспрабуйце напісаць на гэтыя адрасы альбо змясціце запыт у інтэрнэце.

Апытваць можна і суседзяў, сяброў, калег па рабоце таго сваяка, пра якога вы стараецеся сабраць больш інфармацыі. У іх (а таксама ў музеях прадпрыемстваў і навучальных установах) маглі захавацца старыя фатаграфіі, на якіх ёсць у тым ліку і ваш продак. Да таго ж, знаёмыя могуць падзяліцца ўспамінамі пра характар і жыццё канкрэтнага чалавека.

Не забывайцеся, што шмат інфармацыі захоўваецца ў дакументах, якія выдаюць службы загс (такіх, як пасведчанні аб нараджэнні, шлюбе, смерці, змене прозвішча).

Шмат можа даць падарожжа па мясцінах, дзе жылі вашы продкі. Не абмініце мясцовыя архівы і бібліятэкі, пагартайце старонкі раёнак — там можна знайсці багата матэрыялаў, сабраных тутэйшымі краязнаўцамі. Прозвішчы і імёны захоўваюць старыя магілкі (дарэчы, сёння ў інтэрнэце можна знайсці асобныя электронныя некропалі).

### ПРЫСТУПКІ Ў МІНУЛАЕ

Важна паступова паглыбляцца ў гісторыю, не скакаць цераз пакаленні. Гэта не толькі засцеража вас ад памылак, але і дасць багаты матэрыял для пошукаў. Перш чым зрабіць наступны крок у мінулае, не палянуйцеся пераправерыць інфармацыю, супаставіць звесткі ад некалькіх сваякоў.

Працаваць з сямейнай гісторыяй можна па тэмах. Так, сёння даступны матэрыялы, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной (базы «Мемарыял», «Подзвиг народа», «Партызаны Беларусі», «Яд Вашэм», дакументы па эвакуіраваных, спісы ахвяр, кнігі «Памяць»).

Спускаецеся ніжэй — вывучайце спісы рэпрэсаваных, шукайце дакументы па Першай сусветнай вайне.

У XIX — пачатку XX стагоддзя ў розных гарадах выпускаліся кнігі-даведнікі.

Нават родавыя прозвішчы ці мянушкі асобных членаў роду могуць падкінуць ідэю для даследавання.

Не забудзьцеся далучыць да генеалагічных пошукаў дзяцей. Разам з вамі яны будуць чытаць подпісы на старых фатаграфіях, пячы бліны па бабуліным рэцэпце, афармляць генеалагічны альбом ці кнігу, вывучаць гісторыі пра сваіх продкаў. А пасля яшчэ змогуць падзяліцца вопытам сваёй сям'і па захаванні памяці — у школьнай праграме ёсць некалькі ўрокаў, прысвечаных гэтай тэме.

Архіў

# Паліцыя супраць эпідэмій

**Адсутнасць урачэбных інстытутаў і ўстаноў, наогул дзяржаўнай сістэмы аказання дапамогі, недахоп медыцынскага персаналу, нескаардынаванасць і неарганізаванасць дзеяннях урачоў — такой была медыцына XVIII стагоддзя. Ды і людзі ў той час не надта ёй давяралі, а пры сур'ёзных праблемах маглі хутчэй звярнуцца да знахараў ці асоб, якія сябе за такіх выдавалі. «Лячылі» яны, мякка кажучы, арыгінальна. Напрыклад, праблемы са зрокам такія «знаўцы» выпраўлялі пры дапамозе вачэй сокала. Да ран, каб хутчэй загойваліся, маглі прыкладаць сабаку — згадайце выраз «зажыве як на сабаку». Махляры маглі прапаноўваць і чароўныя сродкі — ад каменя, які нібыта вылечвае ўсе хваробы, да парашку «з рога аднарога».**

Асноўным сродкам лячэння было кровапусканне. Часам спрабавалі змагацца з сімптомамі альбо заглушыць «праблему» — выкарыстоўваліся паслабляльныя, гарачкапаніжальныя, патагонныя сродкі, а таксама тыя, што ўмацоўваюць і ўзбуджаюць. Сярод лекаў тых часоў былі папулярныя салетра, нашатыр, камфара, спірт з перцам, дзёгаць, опіум, іртуць з цукрам, блёкат. У аптэкарскіх садах вырошчваліся розныя зёлкі. Рэвень і мята, вядомыя ў той час, і па сёння ў пашане.

### СТАРАЖЫТНЫ КАРАНЦІН

У метрычных кнігах можна сустрэць назвы хвароб, якія ўжываліся для вызначэння прычыны смерці. Так, пры маланкавым развіцці сібірскай язвы казалі пра змяніны пастрэл, агнявік. Лятучы агонь, ветранік — назвы воспы, пачасуха (свароб, парша, струп) — кароста, бешыха (буйства, вадабоязь) — шаленства, круп — інфекцыйна-запаленчае захворванне гартані, часцей у дзяцей. Часам пад адной і той жа назвай маглі падавацца розныя хваробы ці асобныя сімптомы.

Гісторыкі падлічылі, колькі ж эпідэмій пракацілася праз нашы землі, і прыйшлі да высновы, што з XV да XVIII стагоддзяў іх вядома каля 80. Часта паморкі дапаўняліся войнамі ці іншымі вялікімі катаклізмамі.

Падчас фестывалю ХабСудТэх гісторык-генеолаг, кансультант генеалагічнага праекта «Адвеку» Аляксей Білецкі, які працуе з дакументамі Нацыянальнага гістарычнага архіва горада Гродна, расказаў, якое было з пункту гледжання эпідэмій XIX стагоддзе. У самым яго пачатку, а пасля ў 1829, 1845 гадах людзі хварэлі на тыф. У 1830-я гады яны сутыкнуліся з новай бядой — халерай (яна найбольш лютавала ў 1830, 1848, 1853, 1856, 1860–70-я, 1893, 1910 гады). У 1870-я гады праблема была з воспай. У 1812-м, 1828-м, 1838-м, 1879-м — аб'явілася чума.

Разлічваць на медыцынскую дапамогу да пачатку XIX стагоддзя не выпадала — урачоў было вельмі мала, таму прадухіляць і спыняць эпідэміі дапамагалі... паліцэйскія. «Паліцэйскіх чыноўнікаў было дастаткова, каб збіраць звесткі пра сітуацыю, якая складваецца ў павеце, і кантраляваць насельніцтва», — расказаў Аляксей Білецкі.

Праўда, улады часта зацягвалі з прыняццем рашэнняў адносна прадухілення распаўсюджвання хвароб. Вяскоўцы перадавалі звесткі земскай паліцыі, тая — у медыцынскую ўправу. Пакуль урач прыязджаў на месца, магло здарыцца, што лячыць яму ўжо не было каго альбо хвароба сама ішла на спад.

Калі насельніцтва ратавалася ад масавых захворванняў, маглі закрывацца гарады ці асобныя кварталы. Часам да справы падключаліся вайскоўцы. Варта стаяла на дарогах, каля гарадскіх сцен, было і такое, што зачынялі і асобныя гарадскія кварталы. Не пускалі чужых і ў вёскі. Людзей абкуралі (часцей за ўсё палынам і ядлоўцам). У архівах можна сустрэць карэспандэнцыю, якая пракурвалася серай і была праткнутая іголкамі, каб дэзінфіцыруючыя рэчывы трапілі ўнутр пісьма.

Натуральна, хворых стараліся ізаляваць ад здаровых. Памерлых і іх рэчы спальвалі, закопвалі з прымяненнем вапны.

Але не заўсёды такія захады ўратоўвалі, бо знаходзіліся нязгодныя з каранцінам і правілы часта парушаліся.

# Калі вас разлучыла вайна...

**Нават праз 75 гадоў пасля заканчэння Другой сусветнай вайны людзі працягваюць шукаць сваіх блізкіх. Алічбоўваюцца архівы, у інтэрнэце выкладваюцца раней невядомыя дакументы, з'яўляюцца новыя пошукавыя суполкі і сайты. Сарыентавацца ў гэтым аб'ёме інфармацыі не заўсёды проста. Але на дапамогу пачаткоўцам гатовы прыйсці спецыялісты. Напрацягу трох дзён (з 8 да 10 сакавіка) на Youtube ў прамым эфіры яны будуць дзяліцца ідэямі, уласнымі напрацоўкамі, даваць парады па пошуку звестак як пра вайскоўцаў, так і пра мірных ахвяр вайны.**

Планueцца, што падчас фестывалю ХабСудТэх «Усе грані памяці» прагучыць 75 дакладаў ад спецыялістаў з розных краін свету , якія працуюць з архівамі і займаюцца пошукам інфармацыі пра тых, хто загінуў ці пацярпеў у гады Другой сусветнай. Агульны час трансляцыі зноў жа падводзіцца пад юбілейную лічбу – 75 гадзін!

Фестываль праходзіць у межах буйнога міжнароднага адукацыйнага праекта «ГенЭкспа», арганізатарамі якога выступаюць грамадскае аб'яднанне «Архіўны дазор» (кіраўнік Віталь Сямёнаў), генеалагічная фірма «Дом сямейных традыцый» у партнёрстве з «Клубам генеалогікаў» і вытворцам генеалагічнага праграмнага забеспячэння «Дрэва жыцця». Напрацягу красавіка ўжо прайшлі дзве буйныя відэасустрэчы: спецыялісты ў галіне генеалогіі насычалі інфармацыйную прастору карысныімі ведамі па аднаўленні «сямейных ланцужкоў» і захаванні памяці па гісторыі роду. Правам свабоднага мікрафона скарысталіся дзясяткі спецыялістаў, якія вядуць пошукі і працуюць з архівамі на тэрыторыі постсавецкіх краін і Еўропы. Сярод іх былі як спецыялісты з вялікім «генеалагічным» стажам, так і аматары, якія самастойна спрабуюць разабрацца ў гісторыі сваёй сям'і. Яны дзяліліся спасылкамі на карысныя рэсурсы, інструментамі пошуку, правіламі работы з сямейнымі архівамі і парадамі, як аформіць і перадаць нашчадкам вынікі сваіх даследаванняў. Такая праца будзе працягвацца — на гэты год запланаваны шэраг новых анлайн-сустрэч.

Народжаны падчас каранавіруса, самаізаляцыі ды павальнага пераносу камунікацый у Zoom, фестываль выклікаў асаблівую цікавасць у людзей, якія хочуць захаваць гісторыю свайго роду, а гэта патрэба сёння абвастраецца як ніколі, прымушае задумацца, што трэба цаніць кожны дзень, які можна правесці з блізкімі людзьмі.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Спорт-тайм

# ТУРНІР У МІНСКУ СТАНЕ КЛЮЧАВЫМ ЭТАПАМ АДБОРУ НА АЛІМПІЯДУ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Адбыліся матчы 7-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Салігорскі «Шахцёр» атрымаў буйную перамогу над футбалістамі «Іслачы» — 4:0, «Белшына» (Бабруйск) саступіла «Дынама» (Брэст) — 0:3. Вынікі астатніх сустрэч: «Віцебск» — «Славія» (Мазыр) — 2:3, «Мінск» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — 2:5, «Рух» (Брэст) — «Гарадзея» — 1:1, «Смалявічы» — «Энергетык-БДУ» (Мінск) — 0:2, «Дынама» (Мінск) — «Слуцк» — 1:2, БАТЭ — «Нёман» (Гродна) — 3:1.

Турнірнае становішча пасля сямі тураў: «Слуцк» — 16 ачкоў, «Тарпеда-БелАЗ» — 14, БАТЭ — 13, «Іслач», «Энергетык-БДУ» — па 12, «Шахцёр» — 11, «Славія», «Віцебск», «Гарадзея», «Дынама» (Брэст) — па 10, «Дынама» (Мінск), «Мінск», «Рух» — па 9, «Нёман» — 8, «Смалявічы» — 3, «Белшына» — 2.



Спіс найлепшых бамбардзіраў узначальваюць Валерый Гарбачык («Тарпеда-БелАЗ»), Гегам Кадзімян («Нёман»), Яўген Шыкаўка («Дынама», Мінск), Джасурбек Яхшыбаеў («Энергетык-БДУ»), якія забілі па чатыры мячы.

Наступны тур чэмпіянату пройдзе 8–10 мая.

**2.** ***Беларускі трэнер Андрэй Скабелка ўзначаліў яраслаўскі «Лакаматыў».*** Такая інфармацыя змешчана на афіцыйным сайце клуба Кантынентальнай хакейнай лігі. Кантракт разлічаны на тры гады. Нагадаем, раней Андрэй Скабелка працаваў з «Гомелем», які пад яго кіраўніцтвам заняў трэцяе месца ў чэмпіянаце Беларусі (2010). Таксама ў яго трэнерскай кар'еры былі «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад), «Сібір» (Новасібірск), «Авангард» (Омск). Апошнім месцам работы беларуса, які ў 2016 і 2019 гадах станавіўся найлепшым трэнерам краіны, быў казахстанскі «Барыс». Два сезоны запар каманда аказвалася на другім месцы ва Усходняй канферэнцыі па выніках рэгулярнага чэмпіянату КХЛ і двойчы даходзіла да другога раўнда плэй-оф. Таксама Андрэй Скабелка займаў пасады галоўнага трэнера зборных Беларусі і Казахстана.



**3.** ***Сусветныя пляжныя гульні, якія планаваліся на 2021 год, перанесены на 2023-і.*** Такое рашэнне прынята Асацыяцыяй нацыянальных алімпійскіх камітэтаў. У студзені АНАК пачала прыём заявак на правядзенне Сусветных пляжных гульняў 2021 і 2023 гадоў, але з-за распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі і пераносу летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа сусветны спартыўны каляндар зведаў значныя змены. Арганізоўваць яшчэ адны комплексныя спаборніцтвы ў шчыльным графіку 2021 года праблематычна, лічаць у асацыяцыі. «Сусветныя пляжныя гульні створаны спецыяльна для нацыянальных алімпійскіх камітэтаў і іх спартсменаў, каб прыцягваць да турніраў новыя пакаленні атлетаў па розных відах спорту і балельшчыкаў. Услед за летнімі Гульнямі ў Токіа ў 2021 годзе стартуюць зімовыя, гэта вялікая нагрузка на спартыўныя арганізацыі», — адзначыў выканаўца абавязкаў прэзідэнта АНАК Робін Мітчэл.

**4.** ***Чэмпіянат свету па сучасным пяціборʼі ў Мінску, які пройдзе з 7 да 13 чэрвеня 2021 года, стане заключным этапам адбору на XXXII Алімпійскія гульні ў Токіа.*** Такое рашэнне прынята Міжнародным саюзам сучаснага пяціборʼя. Прэзідэнт UIPM Клаус Шорман, наведаўшы з афіцыйным візітам НАК Беларусі ў сакавіку, адзначыў, што мінскі сусветны форум можа стаць адным з самых важных для развіцця гэтага віду спорту. Амаль праз два месяцы саюз апублікаваў новую сістэму кваліфікацыі, згодна з якой мінскі чэмпіянат набывае статус ключавога турніру ў сезоне. Адзначаецца, што ўсе спартсмены, якія заваявалі алімпійскія ліцэнзіі на спаборніцтвах 2019 года, застаюцца іх уладальнікамі. Усе кваліфікацыйныя ачкі, набраныя да моманту спынення спаборніцтваў, будуць залічаны ў сусветны алімпійскі рэйтынг.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.25 | 20.49 | 15.24 |
| Віцебск — | 5.09 | 20.43 | 15.34 |
| Магілёў — | 5.15 | 20.39 | 15.24 |
| Гомель — | 5.17 | 20.30 | 15.13 |
| Гродна — | 5.41 | 21.03 | 15.22 |
| Брэст — | 5.47 | 20.58 | 15.11 |

## Месяц

*Першая квадра 30 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

***Пр.*** *Віталя, Гаўрылы, Клімента, Лукі, Усевалада, Фёдара.*
***К.*** *Ірэны, Тамары, Вінцэнта, Тодара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




# Даты Падзеі Людзі

## 5 МАЯ

У краіне

**1825** год — нарадзіўся (Літва) Фадзей Антонавіч Гарэцкі, мастак. Творчасць звязана з культурным жыццём Беларусі, Расіі і Польшчы. Вучыўся ў Вільні ў Валенція Ваньковіча, у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў у Карла Брулова, якому дапамагаў у выкананні роспісаў у Ісакіеўскім саборы ў Пецярбургу. У 1848–1849 гадах і ў 1855-м жыў на Віцебшчыне, з 1856-га — пераважна ў Парыжы. Аўтар жанравых палотнаў «Апошняе прычашчэнне», «Споведзь маладой дзяўчыны ў ксяндза», «Хрыстос блаславіў дзяцей», партрэтаў Адама Міцкевіча, Пятра Клота, пейзажаў.



**1940** год — нарадзіўся Алефцін Мікалаевіч Калабаеў, беларускі вучоны ў галіне гідратэхнікі, воднай гаспадаркі і экалогіі, доктар тэхнічных навук (1986), прафесар (2006). У 1962-м скончыў БПІ. Працаваў у Цэнтральным НДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў, з 2003 года ў БНТУ. Аўтар навуковых прац па спосабах і метадах вядзення воднага кадастра, інфармацыйных сістэм воднай экалогіі.

У свеце

**1815** год — нарадзіўся Эжэн Марэн Лабіш, французскі камедыёграф. Аўтар п'ес, вадэвіляў, самыя вядомыя з якіх — у тым ліку «Саламяны капялюшык» і «Падарожжа спадара Перышона».



**1880** год — нарадзіўся Міхаіл Міхайлавіч Фокін, рускі артыст балета, балетмайстар і педагог, кіраўнік балетнай трупы «Рускіх сезонаў» у Парыжы (1909–1912, 1914).

**1915** год — нарадзіўся Яўген Аронавіч Далматоўскі, расійскі паэт. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1950).

**1930** год — нарадзіўся Леанід Іванавіч Абалкін, расійскі вучоны ў галіне праблем эканомікі, навуковы кіраўнік Інстытута эканомікі РАН, акадэмік РАН, замежны член НАН Беларусі (2000).

**1940** год — нарадзіўся Ліён Майсеевіч Ізмайлаў, расійскі пісьменнік-сатырык, артыст эстрады.

**1945** год — саюзныя войскі цалкам вызвалілі тэрыторыю Даніі і Нідэрландаў ад фашысцкай акупацыі.

У гэты ж дзень пачалося Пражскае ўзброенае паўстанне супраць гітлераўскіх акупантаў, якое стала адной з самых яркіх старонак чэшскага Супраціву. Танкавая брыгада арміі ЗША вызваліла вязняў нямецка-фашысцкага канцлагера Маўтхаўзен на тэрыторыі Аўстрыі.

**1955** год — уступіла ў сілу Еўрапейская культурная канвенцыя.

Так гаварыў...

**РЭМАРК:**

*«Смерць аднаго чалавека — гэта смерць, смерць двух мільёнаў — толькі статыстыка».*

# УСМІХНЕМСЯ

— Павел, вы так падобны на майго трэцяга мужа!
— А колькі іх у вас было?
— Два.

**— Любачка, ты ўся такая паветраная...**
**— Як бізэ?**
**— Як трывога.**

— Каханы, давай сходзім у цырк.
— Навошта?
— Паглядзім на нашы стасункі з боку.

**— Дзяніс, а ты падчас сексу з жонкай размаўляеш?**
**— А што, Мікіта, рабіць? Раз тэлефануе — трэба адказваць.**

— Лявон, колькі ты будзеш швэндацца па бабах! У нас ужо трое дзяцей, і ніводнага ад цябе!

**— Ведаеш, гэта такое прыемнае адчуванне, калі купіла штосьці, што табе зусім не патрэбнае, але на душы так цёпла, што яно ў цябе ёсць...**
**— Я цябе разумею, я так замуж выйшла.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1433.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 мая 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12